Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 ЛІПЕНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №132 (28496)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Нюансы пераходнага ўзросту**



**Калі прапрадзед велікан...**



**Як сумясціць спорт з кіраўніцтвам**

СТАР. 15

# Зрабіць правільны выбар

## Кіраўнік дзяржавы заклікаў журналістаў не забывацца пра маральныя каштоўнасці




Фота БЕЛТА



**Гібрыдныя войны, адказнасць за напісанае, сказанае, агучанае, пытанне маральнага выбару журналіста. Гэтыя тэмы ўзняў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на пленарным пасяджэнні XIX Сусветнага кангрэса рускай прэсы, які праходзіць у гэтыя дні ў Беларусі.**

### Сіла слова

Сёння не ўсё залежыць ад рашэнняў, якія прымаюць палітыкі і кіраўнікі дзяржаў, а задача СМІ ўжо не абмяжоўваецца фіксаваннем падзей. Усё большую ролю ў фарміраванні грамадскай думкі пачынае адыгрываць прэса, якая ўплывае ў тым ліку і на лідараў дзяржаў. «У сувязі з гэтым на парадак узрастае адказнасць за публічнае слова — і ў палітыка, і ў журналіста», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Менавіта журналісты ствараюць карціну свету. «Таму каласальнае значэнне набываюць прафесіяналізм і грамадзянская адказнасць людзей са сферы масмедыя. Вядома, чытач патрабуе сенсацый. Газеты, тэлеканалы, інтэрнэт-выданні, асабліва ў сучасным свеце, у многім выжываюць за кошт скандалаў, часта імі ж і арганізаваных. Але ці не вельмі высокай можа аказацца цана такіх падыходаў?» — звярнуўся да ўдзельнікаў кангрэса Прэзідэнт.

СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ГОРВАЛЬ, начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва:**

*«Адраснае жыллёвае субсідзіраванне заменіць дзеянне Указа аб дапамозе маладым і шматдзетным сем'ям пры будаўніцтве жылля. Указ №585 у адпаведнасці з Указам №240 спыняе дзеянне 6 жніўня. Тыя, хто мае рашэнне выканкамаў аб выдзяленні субсідый, будуць іх атрымліваць. Калі рашэння не будзе да гэтага часу, то па гэтых крэдытах субсідыі выплачвацца не будуць. Падкрэслю таксама, што маладыя і шматдзетныя сем'і па Указе №240 таксама могуць разлічваць на дзяржпадтрымку, атрымліваючы субсідыі на выплату часткі працэнтаў або кампенсацыю асноўнага доўгу. Калі гаварыць пра баланс інтарэсаў, новы Указ будзе ў шэрагу выпадкаў больш выйгрышны за субсідыі, якія выдаваліся раней».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.07.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9780 | ▼ |
| Еўра | 2,2650 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0326 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0763 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

Славянскі базар

# УВАГА: ГАВОРЫЦЬ І ПАКАЗВАЕ ВІЦЕБСК!

**Сёння, 13 ліпеня, а палове дзявятай гадзіны вечара ў Летнім амфітэатры распачнецца ганаровае адкрыццё XXVI Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Разам з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у цырымоніі «старту» возьме ўдзел і Прэзідэнт Малдовы Ігар Дадон, які ў гэтыя дні знаходзіцца ў Беларусі з афіцыйным візітам.**

І, вядома, пасля таго, як прагучаць афіцыйныя акорды фестывалю, вядучыя на беларускай, рускай і ўкраінскай мовах скажуць: «Увага: гаворыць і паказвае Віцебск!»

Падчас цырымоніі адкрыцця фестывалю кіраўнік нашай краіны ўручыць Тамары Гвердцытэлі, народнай артыстцы Расіі, народнай артыстцы Грузіі, спецыяльную ўзнагароду «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення». «Зоркі» з розных краін выступяць на сцэне ўнікальнай канцэртнай залы, якая ўмяшчае больш за 6 тысяч гледачоў. Тыя, каму не пашчасціла купіць білеты, убачаць трансляцыю яскравага шоу па тэлебачанні.

### «КУЛЬТУРНАЯ СТАЛІЦА» СВЕТУ

Без перабольшвання Віцебск у гэтыя дні можна назваць «культурнай сталіцай» усіх кантынентаў. За час правядзення «базару» тут, бадай, не было толькі прадстаўнікоў Арктыкі і Антарктыды.

Сёлета ў Віцебск прыехалі спевакі, танцоры, музыканты, акцёры, мастакі з 36 краін. Упершыню фестывальны Віцебск наведалі ўдзельнікі з Эквадора і Нігерыі. Усяго свята сабрала каля 5000 гасцей. Гэты паказчык штогод прыкладна на адным узроўні. Дарэчы, калі памножыць колькасць акрэдытаваных удзельнікаў на 26 гадоў правядзення «базару», атрымаецца лічба, роўная насельніцтву горада памерам з райцэнтр. Прыкладна столькі ж — больш за 130 тысяч чалавек — жывуць, напрыклад, у Оршы і яе гарадках-спадарожніках.

У дырэкцыі фестывалю паведамілі, што на працягу ўсіх фестывальных дзён адбудзецца каля 160 мерапрыемстваў. Толькі ў Летнім амфітэатры запланаваны 18 канцэртаў.

СТАР. 16

■ Уласная бяспека

# ЧУЖЫЯ ТУТ НЕ ХОДЗЯЦЬ

## Кватэрныя зладзеі ўвесь час павышаюць кваліфікацыю. Але ўправа на іх ёсць

**Старая англійская прыказка гаворыць: мой дом — мая крэпасць. І задача гаспадара — зрабіць гэтую самую крэпасць як мага больш непрыступнай. Праўда, ва ўсе часы знаходзіліся тыя, хто спрабаваў квапіцца на чужое дабро. Цяпер жа абараніць ад такіх нязваных гасцей сваё жытло вельмі проста дзякуючы каналам сувязі. Але і выкраданне маёмасці з кватэр і дамоў у мінулае, на жаль, не сышло...**

### Крадзяжоў стала меней на траціну...

— Гэтыя злачынствы складаюць больш за 63% ад усіх злачынстваў па лініі крымінальнага вышуку, — расказвае **намеснік начальніка ўпраўлення — начальнік аддзела «І» 2-га ўпраўлення галоўнага ўпраўлення крымінальнага вышуку Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Андрэй МІКУЛІЧ.** — Год ад году іх колькасць аднак змяншаецца. А выкрывальнасць іх, наадварот, павялічваецца. Напрыклад, возьмем 2007 год. Па краіне тады было здзейснена 102 тысячы крадзяжоў. Здолелі тады раскрыць не больш за траціну такіх злачынстваў. За 2016 год зарэгістравана ўжо 37 тысяч крадзяжоў. Падзенне — амаль утрая! І раскрывальнасць наблізілася да паловы выпадкаў. 45% зламыснікаў — людзі, раней асуджаныя за крадзеж. Большасць з іх нідзе не працуе і не вучыцца. У сукупнай масе крадзяжоў асноўная іх частка мае дачыненне да жылых дамоў і кватэр. Гэта прыблізна 40—45%. А вось, напрыклад, выкраданне маёмасці з аўтамабіляў сустракаецца нашмат радзей.

Існуе думка, што металічныя дзверы і процьма замкоў абароняць кватэру ад аматараў квапіцца на чужое дабро. Гэты стэрэатып як узнік у 90-я, так нікуды і не падзеўся. Але і «кваліфікацыя» зладзеяў на месцы два з лішнім дзясяткі гадоў таксама не стаяла.

СТАР. 3

# Зрабіць правільны выбар

## Рэйтынг — не апраўданне

Імкненне грамадства даведацца пра ўсё, а СМІ — данесці інфармацыю як мага хутчэй, непазбежна прыводзіць да памылак і часам да перайначвання фактаў, якія ў выніку разыходзяцца з рэчаіснасцю. «Гэта інфармацыя становіцца зброяй, якая правакуе канфлікты і ўзброеныя сутыкненні, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Распальваючы варожасць і нянавісць, не дае магчымасці для мірнага будаўніцтва, здаровага абмеркавання розных думак, палітычных і сацыяльных падыходаў да жыцця. І тут, пагадзіцеся, наўрад ці можна апраўдацца рэйтынгамі».

Беларускі лідар звярнуў увагу на тэму так званых гібрыдных войнаў, якія вядуцца ў медыя, эканоміцы, палітыцы, кіберпрасторы. «Я падводжу да таго, што важнейшай, можа, першай ступенню гэтых сучасных войнаў з'яўляюцца войны ў медыяпрасторы. Ідзе не артылерыйская падрыхтоўка, а падрыхтоўка ў СМІ, перш чым той ці іншай дзяржаве, групоўцы развязаць вайну», — заявіў Прэзідэнт.

## Свабода — значыць адказнасць

Навязваць журналістам меркаванне, заганяць у рамкі нейкіх стэрэатыпаў недапушчальна, лічыць Аляксандр Лукашэнка. «Сэнс сапраўднай свабоды слова, якую мы ў Беларусі высока цэнім, не толькі ў магчымасці выбару, але і ў адказнасці за яго. Давайце будзем адзіныя ў галоўным — у пошуку і сцвярджэнні праўды», — падкрэсліў беларускі лідар.

Прэзідэнт выказаў спадзяванне, што вынікам правядзення кангрэса стануць канструктыўныя ініцыятывы, якія даюць магчымасць ачысціць інфармацыйную прастору ад бруду і хлусні. «У свой час Беларусь стала найбуйнейшай пляцоўкай мірнага ўрэгулявання. Наша краіна заўсёды была і застаецца адкрытай для новых кантактаў і інфармацыйных абменаў. Чаму б нам не прыйсці да рэалізацыі ідэі па правядзенні ў Мінску маштабнага міжнароднага форуму — аналага «Хельсінкі-2»? Чаму б не збірацца разам, прыцягваючы палітыкаў, дзеячаў навукі, культуры, бізнес-эліты для абмеркавання праблем захавання міру?» — сказаў кіраўнік дзяржавы.

## Праўда ў эпоху інтэрнэту

Прафесія журналіста ў новых тэхналагічных умовах кардынальна змянілася, адбыўся пераход да новай сістэмы стварэння і распаўсюджвання інфармацыі — грамадзянскай журналістыкі. Цяпер у якасці масмедыя можа выступіць практычна любы чалавек, які мае тэлефон і выхад у інтэрнэт. Пры гэтым для многіх людзей сусвет звузіўся да экрана смартфона, а карціна сусвету — да стужкі навін у сацыяльных сетках, лічыць Аляксандр Лукашэнка.

На інфармацыйным полі складваецца няпростая сітуацыя. Таму ў гэтых умовах менавіта ад прафесійных журналістаў, ад традыцыйнай прэсы шмат у чым залежаць маральныя і грамадзянскія арыенціры. «Таму заўсёды важны правільны выбар: рэйтынг альбо праўда, аб'ектыўнасць альбо асабістыя інтарэсы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

## Агульны набытак

Асобна кіраўнік дзяржавы звярнуўся да тэмы рускай мовы, якая разам з беларускай з'яўляецца ў нашай краіне дзяржаўнай. Па яго словах, гэта робіць нашу краіну і народ адметнымі. «Дзякуючы гэтаму мы маем магчымасць больш маштабных і прамых кантактаў у галіне навукі, культуры і мастацтва. Пашыраем інтэлектуальныя і інфармацыйныя гарызонты плённага супрацоўніцтва з брацкімі народамі, прасоўваючы ідэі добрасуседства і міралюбнасці», — адзначыў Прэзідэнт.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, рускамоўная журналістыка мае велізарную аўдыторыю і сферу ўплыву, адыгрывае найважнейшую ролю носьбіта ўсходнеславянскага культурнага кода, агульных каштоўнасцяў і жыццёвых арыенціраў.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На палях пасяджэння ў ХІХ Сусветнага кангрэса рускай прэсы Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з паслом добрай волі ЮНЕСКА, прэзідэнтам Сусветнай асацыяцыі рускай прэсы Віталем Ігнаценкам і адказным сакратаром Сусветнай асацыяцыі рускай прэсы, першым намеснікам генеральнага дырэктара інфармацыйнага агенцтва ТАСС Міхаілам Гусманам, паведамляе БЕЛТА.

На сустрэчы абмяркоўваліся глабальныя тэмы, у тым ліку ініцыятывы, вылучаныя Беларуссю падчас 26-й летняй сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ па арганізацыі новага маштабнага міжнароднага форуму па аналогіі з Хельсінкскім працэсам, а таксама роля сродкаў масавай інфармацыі ў сучасных працэсах у свеце.

Аляксандр Лукашэнка таксама даў кароткае інтэрв'ю агенцтву ТАСС. У ім закрануліся такія тэмы, як вынікі пасяджэння ў Маскве Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы, развіццё беларуска-расійскіх адносін па важнейшых напрамках, перспектывы і праблемы функцыянавання Саюзнай дзяржавы. Таксама абмяркоўваліся пытанні, сугучныя тэматыцы Сусветнага кангрэса рускай прэсы. Вынікам размовы стане новая серыя праграмы з цыкла «Формула ўлады», якая, як плануецца, выйдзе ў жніўні.

## Гавораць удзельнікі

**Міністр інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ:**

— Беларусь шмат зрабіла для развіцця нацыянальных СМІ і не аддзяляе сябе ад агульнай інфармацыйнай прасторы. Ужо ў першы дзень кангрэса да яго ўдзельнікаў неаднаразова звярталіся прадстаўнікі масмедыя, грамадскасці і бізнесу, многія з якіх цікавіліся, чаму СМІ сталі так мала казаць пра галоўнае — пра стваральную працу. Няхай гэта тэма стане галоўнай на палях нашых інфармацыйных дзён у Беларусі.

**Галоўны рэдактар радыёстанцыі «Эхо Москвы» Аляксей ВЕНЕДЫКТАЎ:**

— Аляксандр Лукашэнка правільна паставіў дыягназ тых пагроз, якія на нас ідуць. Ва ўмовах лічбавай рэвалюцыі, развіцця сацыяльных сетак кожны чалавек, які не мае дачынення да журналістыкі і СМІ, мае рэальную магчымасць стварыць уласны інфармацыйны паток, публікуючы тое, што ён лічыць навінамі. Кантраляваць такі паток, які па асобных параметрах можа нават перакрываць прафесійную журналістыку, вельмі складана. Аднак з гэтай дэструктыўнай з'явай неабходна змагацца сваімі сучаснымі і эфектыўнымі метадамі. Мне ўяўляецца, што ўнясенне прафесіяналізму ў гэтую хвалю — адзін са спосабаў знутры яе прывесці ў нейкі стан праўдападобнасці.

**Акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр КАВАЛЕНЯ:**

— У цяперашніх умовах давер аўдыторыі да масмедыя страчваецца. Як чалавек, які пачынае раніцу з прачытання навін, думаю, што сёння, сапраўды, надзвычай шмат інфармацыі негатыўнага характару. Аўдыторыя «перакормлена» негатывам. Акцэнтаваць увагу чытачоў, гледачоў і слухачоў варта ў большай ступені не на негатыўных момантах, у тым ліку ў двухбаковых адносінах Беларусі і Расіі, а на тых фактах, якія даюць магчымасць СМІ выглядаць больш пазітыўна ў інфармацыйнай прасторы. Неабходна вярнуцца да таго, каб з'яўлялася больш станоўчых вобразаў, якіх у нашым жыцці звышдастаткова. У нас ёсць людзі, на якіх мы павінны раўняцца.

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## У Францыі самы вялікі абарот фальшывых еўра

Самы вялікі аб'ём фальшывых банкнотаў у еўразоне канфіскоўваюць у Францыі, піша газета Le Figaro са спасылкай на звесткі паліцыі.

У 2015—2016 гадах на Францыю прыходзілася 34% абароту фальшывых еўра, па гэтым паказчыку краіна абышла Італію, Германію і Іспанію. Часцей за ўсё зламыснікі падрабляюць банкноты наміналам 20 і 50 еўра — яны складаюць 87% ад агульнай масы канфіскаваных фальшывых грошай, падлічылі ў паліцыі. Пры гэтым за названы перыяд як у Францыі, так і ў цэлым па Еўропе, адзначана зніжэнне аб'ёму фальшывых грошай. Паводле прагнозу паліцыі, гэтая тэндэнцыя працягнецца і сёлета — асабліва за кошт увядзення ў абарачэнне новай купюры ў 50 еўра з вышэй узроўнем абароны.

## У выніку тэрактаў у Нігерыі загінулі 17 чалавек

Ахвярамі чатырох выбухаў у сталіцы нігерыйскага штата Борна горадзе Майдугуры сталі 17 чалавек, яшчэ 21 атрымаў раненні, паведамляе Reuters са спасылкай на заяву мясцовай паліцыі. Усе нападзенні былі здзейснены ў розных частках горада тэрарыстамі-смяротнікамі.

Штат Борна лічыцца найбольш пацярпелым ад шматгадовага супрацьстаяння ўладаў з баевікамі тэрарыстычнай арганізацыі «Заходнеафрыканская правінцыя Ісламскай дзяржавы» (больш вядомая як «Бока Харам»). У снежні 2016 года нігерыйскія ваенныя аб'явілі, што ім удалося захапіць апошні апорны пункт «Бока Харам» у лесе Самбіса, і прэзідэнт Нігерыі Махамаду Бухара заявіў, што тэрарысты канчаткова разгромлены. Аднак святкаванне перамогі аказалася заўчасным: праз некалькі месяцаў баевікі аднавілі набегі.

## У Нарвегіі прапанавалі раздаваць кантрацэптывы падлеткам

Шэраг нарвежскіх маладзёжных аб'яднанняў і секцый палітычных партый выступіў з ініцыятывай бясплатна раздаваць кантрацэптывы па рэцэптах падлеткам ад 16 гадоў, паведамляе The Local.

З 2016 года атрымліваць супрацьзачаткавыя сродкі за кошт дзяржавы маюць права маладыя людзі ва ўзросце ад 16 да 20 гадоў. Цяпер актывісты прапануюць распаўсюдзіць гэтую практыку і на больш юных суайчыннікаў. «Гэта адносіцца толькі да невялікай групы падлеткаў, але калі гэта дапаможа 15-гадовай дзяўчыншы пазбегнуць непажаданай цяжарнасці, мы лічым, што гэта пазітыўна і добра», — сказаў адзін з кіраўнікоў арганізацыі «Секс і грамадства» Тор Холт Фолестад. У Міністэрстве аховы здароўя каралеўства заявілі, што вывучаць гэтую ініцыятыву.

## Ад Антарктыды адкалоўся гіганцкі айсберг



Ад Антарктыды адкалоўся, як мяркуецца, самы буйны айсберг у гісторыі — памерам з чатыры Лонданы.

Адзін з найбуйнейшых айсбергаў з калі-небудзь зарэгістраваных адкалоўся на паўднёвым захадзе Антарктыкі, на антарктычным шэльфе, паведамляе Бі-бі-сі. Расколіна з'явілася больш за дзесяць гадоў таму, а распад ледзянога шэльфа «Ларсена С» пачаўся на ўсходнім фронце Антарктыды ў 2014 годзе. Шэльф складаўся з трох буйных ледніко — «Ларсен А», «Ларсен В» і «Ларсен С». Зараз адкалоўся апошні з тых, што засталіся, — «Ларсен С». У чэрвені раскол у ім дасягнуў 13 км ад краю ледніка.

## Сустрэча Прэзідэнтаў Беларусі і Малдовы пройдзе ў Віцебску

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правядзе перагаворы з Прэзідэнтам Малдовы Ігарам Дадонам, які гэтымі днямі знаходзіцца з рабочым візітам у нашай краіне.**

Кіраўнікі дзяржаў правядуць сустрэчу сёння ў Віцебску, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. Прэзідэнты плануюць абмеркаваць увесь спектр беларуска-малдаўскага супрацоўніцтва ў палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сферах. Асобная ўвага будзе ўдзелена ўзаемадзеянню ў фармаце інтэграцыйных аб'яднанняў. У гэты ж дзень Ігар Дадон прыме ўдзел у цырымоніі ўрачыстага адкрыцця ХХVІ Міжнароднага фестывалю «Славянскі базар у Віцебску».

Плануецца, што ў час свайго візіту Прэзідэнт Малдовы таксама сустрэнецца з прадстаўнікамі дзелавых колаў Беларусі і малдаўскай дыяспары, наведае шэраг прадпрыемстваў і сацыякультурных аб'ектаў.

# КАРЫСТАЦЦА, АЛЕ З ПАВАГАЙ І АШЧАДНА

**Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка падпісаў два ўказы, якія датычацца прыродных угоддзяў.**

Указам №248 прадугледжана, што плошча рэкрэацыйнай зоны Нацыянальнага парку «Браслаўскія азёры» будзе павялічана на 286,1 га. Дакумент таксама ўносіць змяненні ў Палажэнне аб Нацыянальным парку «Браслаўскія азёры». У прыватнасці, юрыдычным і (або) фізічным асобам будзе давацца права выкарыстання на возеры Дрывяты водных транспартных сродкаў магутнасцю звыш 15 к. с. пры ўмове заключэння імі адпаведнага дагавора з нацыянальным паркам, які прадугледжвае штогадовую плату ў памеры адной базавай велічыні за кожную конскую сілу рухавіка воднага транспартнага сродку звыш устаноўленай нормы. Атрыманыя паркам сродкі будуць накіроўвацца на добраўпарадкаванне рэкрэацыйнай зоны, узнаўленне каштоўных абарыгенных відаў рыб і зарыбленне рыбалоўных угоддзяў. Наяўнасць дагавора стане падставай для выкарыстання на возеры Дрывяты названых водных транспартных сродкаў і не запатрабуе ўвядзення дадатковых адміністрацыйных працэдур.

Нацыянальнаму парку «Браслаўскія азёры» таксама будзе дадзена магчымасць правядзення работ у рэкрэацыйнай зоне па ўладкаванні экалагічных сцежак, фарміраванні ландшафтаў і выкарыстанні ўнутрыгаспадарчых дарог для пад'езду да спецыяльна абсталяваных аўтамабільных стаянак.

Прапанаваныя змяненні межаў і рэжымаў не закранаюць запаведную зону. Прыняцце Указа дасць магчымасць істотна павысіць турыстычную прывабнасць Браслаўскага рэгіёна і будзе спрыяць прыцягненню дадатковага турыстычнага патоку і павышэнню даходаў ад турыстычнай дзейнасці пры захаванні экалагічнай каштоўнасці тэрыторыі.

Акрамя таго, у адпаведнасці з Указам памяншаецца плошча Нацыянальнага парку «Белавежская пушча» на 1,9 га за кошт перадачы зямель Дабраволькаму сельскаму выканаўчаму камітэту. Гэта дазволіць даць грамадзянам зямельныя ўчасткі для абслугоўвання жылых дамоў, прыватызаваных імі раней у адпаведнасці з распараджэннем Прэзідэнта Беларусі «Аб перадачы ва ўласнасць жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання».

Указ №247 прадугледжвае прыняцце мер для рацыянальнага выкарыстання рыбалоўных угоддзяў. Дакумент устанаўлівае парадак перадачы ў арэнду рыбалоўных угоддзяў (азёр, прыродных вадаёмаў) і зямельных участкаў па ўзгадненні з Прэзідэнтам Беларусі. Акрамя таго, укараняецца комплексная схема размяшчэння паверхневых водных аб'ектаў (сажалкі і абводненых кар'ераў), прыдатных для вядзення рыбаводства, на падставе якой мясцовыя Саветы дэпутатаў будуць перадаваць іх у арэнду.

Указ дасць магчымасць рацыянальна выкарыстоўваць рыбалоўныя ўгоддзі і зямельныя ўчасткі, неабходныя для вядзення рыбалоўнай гаспадаркі, а таксама павысіць эфектыўнасць выкарыстання сажалак і абводненых кар'ераў.

Для рэалізацыі права насельніцтва краіны на бясплатнае аматарскае рыбалоўства дакументам прадугледжваецца не перадаваць у арэнду ўчасткі вадацёкаў (рэкі, ручаі, каналы).

# УЗНАГАРОДА АД БРАЦКАГА НАРОДА

**На ХІХ Сусветным кангрэсе рускай прэсы «Партнёрства ў імя будучыні: прыярытэты сучаснай цывілізацыі» Выдавецкі дом «Звязда» быў узнагароджаны Ганаровай граматай ад урада Расійскай Федэрацыі за подпісам старшыні Дзмітрыя Мядзведзева.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Як адзначаецца ў дакуменце, узнагарода была ўручана «за вялікі ўклад у захаванне рускай мовы і культуры, а таксама ў справу кансалідацыі суайчыннікаў за мяжой».

Выдавецкі дом «Звязда» з'яўляецца вядучым медыйнай і кніжнай прадукцыі галоўным чынам на беларускай мове, разам з тым пэўную частку сваёй выдавецкай дзейнасці вядзе таксама і на рускай. Так, на сёння ў Выдавецкі дом «Звязда» ўваходзяць такія выданні на рускай мове, як газета «Союз-Евразия» (выдаецца як укладка ў газету «Звязда») і часопіс «Нёман». Часткова на рускай мове выходзяць часопісы «Алеся» і «Родная природа». Важнай часткай дзейнасці Выдавецкага дома з'яўляецца і рэалізацыя сумесных праектаў з газетамі і часопісамі Расійскай Федэрацыі.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

■ Глыбінка

# Ліпеньскія клубніцы

## На Лунінеччыне руплівыя гаспадары маюць дадатковы заробак

**Сёлета чэрвеньская ягада з-за капрызаў надвор'я крыху спазнілася. «Такога ніколі не было, каб у ліпені яшчэ ўраджай з клубнічных палёў збіралі», — гаворыць Валянціна Гоза. А цяпер яшчэ два-тры кашы салодкай ягады штодня можна прынесці з градак. Але гэта ўжо апошнія клубніцы. Таму і на рынках вялікіх гарадоў ягада рэзка падскочыла ў цане.**



З Валянцінай Аляксандраўнай мяне пазнаёміў старшыня Сінкевіцкага сельскага Савета Валерый Краснікевіч. Паводле яго слоў, ягадніца з Мокрава — працаўніца — пашукаць такую.

І праўда, цэлых 25 сотак у яе занятыя плантацыяй клубніц. Валянціна Аляксандраўна адразу вядзе карэспандэнта ў поле, ёй хочацца паказаць сваю зялёную гаспадарку.

— Вось гэта я сёння прапалола — паказвае на граду, на вока, так, сотак на восем.

А там ні травінкі, ягадныя кусцікі стаяць на роўнай адлегласці, як на карцінцы! Можна ўявіць, якую нялёгкую працу становіць сабой догляд гэтай ягады. Гаспадыня кажа, што ее рабочы дзень пачынаецца а пятай раніцы, а ў сезон збору ягад — яшчэ раней. Гэтым летам ураджай быў добры, і штодня яны з сынам вазілі ў Дварэц, дзе размяшчаецца аптовы рынак і куды прыязджаюць пакупнікі, па 170—200 кілаграмаў ягады. У апошнія дні мая клубніцы здавалі па тры рублі, а бліжэй да завяршэння сезона кошт вагаўся ў межах ад 1,5 да 1,2 рубля.

Астаткі ўраджаю Валянціна Аляксандраўна раздае цяпер сваякам і знаёмым. Толькі прапануе самім выбраць ягады з поля. А ў яе наступіў сезон праполкі і дагляду раслін. Летась ягадніца набыла расаду новага сорту і вельмі ім задаволеная. Клубніцы выраслі буйныя, сакавітыя — адна ў адну. Цяпер трэба іх рассадзіць.

Асабліва актыўна занялася клубніцамі гаспадыня з Мокрава, калі выйшла на пенсію. Расказвае, што працавала санітаркай на ўчастковай бальніцы. Зарплата была маленькая, і хоць мае жанчына 32 гады стажу, пенсія атрымалася 200 рублёў з хвосцікам. А хочацца і жыць прыстойна, і дзецям дапамагчы. Таму і шчыруе з ранку да вечара гаспадыня на сваім участку. Калі разбіць на 12 месяцаў даход, атрыманы за сезон ураджаю клубніц, якраз выйдзе штомесячная дадатковая зарплата. У розныя гады яна адрозніваецца па памеры, усё залежыць ад ураджаю. Але ж справа таго вартая. Калі сядзець у хаце ці на падворку склаўшы рукі, нічога не заробіш, разважае жанчына.

Кіраўнік мясцовай улады гаворыць, што ў Сінкевіцкім сельсавеце не надта многа вяскоўцаў займаюцца вырошчваннем клубніц на продаж. Гэтым знакаміты Дварэц і яго наваколле. Але і тутэйшыя гаспадары паступова пачынаюць апрабоўваць на сваіх сотках развядзенне салодкай ягады. І атрымліваюць ад гэтага дадатковы заробак. Словам, хто не лянуецца, той мае.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*
*Лунінецкі раён*

■

# ЧУЖЫЯ ТУТ НЕ ХОДЗЯЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Сёлета ў сакавіку затрымалі арганізаваную злачынную групу, якая на працягу некалькіх гадоў здзяйсняла кваліфікаваныя кватэрныя крадзяжы ў Мінску і іншых гарадах — Брэсце, Гродне — шляхам падбору ключа, — працягвае Андрэй Мікуліч. — Прычым працавалі так прафесійна, што ў кватэры не заставалася ніякіх слядоў таго, што тут нехта быў. А праз тыдзень-другі гаспадары высвятлялі, што грашовая «заначка» кудысьці падзелася ці некуды прапалі дарагія ўпрыгажэнні...

## ...але на сігналізацыі эканоміць усё ж не варта

— На сёння самы эфектыўны сродак абароны вашага жылля і маёмасці — заключаны з намі дагавор, — расказвае **намеснік начальніка ўпраўлення сродкаў і сістэм аховы Дэпартамента аховы Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Алег ШАБЛЫКА.** — Мы цяпер сцеражом больш за 170 тысяч кватэр і дамоў. Кошт нашых паслуг за месяц складае ўсяго 7 беларускіх рублёў. Праўда, неабходна будзе выдаткаваць грошы на абсталяванне кватэры сігналізацыяй. А вось гэты цэннік вар'іруецца ў залежнасці ад таго, на якім паверсе знаходзіцца ваша кватэра, і ад яе метражу. Напрыклад, поўная блакіроўка аднапакаёўкі на першым паверсе абыдзецца ў суму 350 рублёў, бо пранікнуць туды можна не толькі праз уваходныя дзверы, але і праз вокны, разбіўшы шкло. Таму датчык у кожным памяшканні, якое мае акно, будзе ўсталяваны абавязкова. Акрамя таго, у стандартны камплект сістэмы ўваходзяць магнітакантактны апавяшчальнік, які рэагуе на адкрыццё дзвярэй, і інфрачырвоны выпраменьвальнік у калідоры, які кантралюе выхады з пакояў і праход каля ўваходных дзвярэй. Яны, як правіла, ставяцца на прамежкавых паверхах дома. Сёлета кватэрных крадзяжоў з ахоўваемых кватэр за пяць месяцаў не было. Хаця спроб пранікнуць туды было некалькі дзясяткаў. Між іншым, карыстальнікі ахоўнай сігналізацыі атрымліваюць прыемны бонус. Наша абсталяванне рэагуе на цеплавое выпраменьванне. І дзякуючы гэтаму былі своечасова выяўлены 6 пажараў.



На канчатковы кошт абсталявання могуць паўплываць і архітэктурныя асаблівасці дома.

— Напрыклад, вы жывяце на другім паверсе, і ваша акно выходзіць роўненька на дах казырка пад'езда. Ці ля якога-небудзь з вокнаў праходзіць пажарная лесвіца, — пералічвае магчымыя сітуацыі **начальнік Мінскага гарадскога ўпраўлення Дэпартамента аховы МУС Беларусі Юрый ФЕДАРЭНКА.** — У такім выпадку ў гэтым памяшканні абавязкова будуць усталяваны датчыкі на разбіццё шкла і на рух. Але «экіпіраваць» падобным чынам кватэру можна на любым паверсе. Усё залежыць ад жадання заказчыка. А для фізічных асоб мы прапануем сістэму трывожнай кнопкі, якая каштуе штомесяц тры з паловай рублі. Таксама ў нашым арсенале ёсць кнопкі пацвярджэння зняцця кватэры з сігналізацыі. Скажам, вы трапілі ў кватэру пад прымусам. Але калі ад вас у пэўны тэрмін не паступіць сігнал на пульт, то да вас выедзе група затрымання.

Датчыкі спрацоўваюць на вагу і памеры. Ёсць апавяшчальнікі з «імунітэтам» ад жывёл. Але калі ваш гадаванец занадта вялікі, то мы не зможам дапамагчы. Напрыклад, няма датчыкаў, якія б не рэагавалі на сабаку вышынёй у холцы, скажам, сантыметраў 80. Але і сэнсу ў гэтым няма. Памеры гэтай жывёлы супастаўныя з памерамі чалавека. А мэта сігналізацыі якраз у тым, каб засячы ў кватэры пабочных асоб.

Доўгія гады сігналізацыя падключаецца пераважна з дапамогай тэлефоннага кабеля. І калі раней усе кабелі сувязі былі медныя, то і ахоўная апаратура доўгі час выпускалася менавіта для іх. Але тэхналогіі змяніліся ў апошні час.

— Цяпер РУП «Белтэлекам» у Мінску актыўна замяняе кабелі сувязі, — працягвае Юрый Федарэнка. — На змену класічнай медзі прыходзіць оптавалакно. Што гэта азначае для жыхароў? Калі ў кагосьці яшчэ застаўся стары працуючы тэлефонны кабель, то мы можам прапанаваць падключыцца па GSM-канале з выкарыстаннем паслуг аператараў сотавай сувязі Velcom і МТС. А апараты, якія працуюць толькі па медзі, мы ўжо не ставім. Таму што не выключана, што праз месяц туды прыйдуць прадстаўнікі «Белтэлекама» і абвесцяць пра тое, што медзь мяняецца на оптавалакно. І чалавеку давядзецца мяняць сістэму сігналізацыі за свой кошт. Гэта было б з нашага боку няправільна. Зрэшты, калі вядома, што оптавалакно падключаць літаральна праз некалькі тыдняў ці пару месяцаў, то мы можам прапанаваць апарат, які разлічаны на работу з оптавалакном, але абсталяваны спецыяльным адаптарам для работы па старой тэлефоннай лініі. Праўда, гэта будзе каштаваць крыху даражэй.

*— А што будзе, калі я забыўся зняць кватэру з сігналізацыі, але ў яе ўвайшоў? — пацікавіўся я.*

— На першы раз мы ніякіх штрафных санкцый не ўжываем. Міліцыянеры адпрацоўць выклік і правядуць тлумачальную гутарку. А вось калі вам захацелася другі раз патрэніраваць групу затрымання — то ўжо, калі ласка, сплачвайце штраф у 5 рублёў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

■ Факт

## ПЯРУН РАЗБУШАВАЎСЯ

**У аўторак па Беларусі пракаціўся магутны навальнічны фронт. Удар стыхіі першымі на сабе адчулі заходнія рэгіёны краіны. Сёлета, аднак, непагадзь разгулялася значна цішэй, чым летась, калі былі павалены тысячы дрэў, а дзясяткі дамоў засталіся без даху. Аднак у сацыяльных сетках з'явіліся фотаздымкі з Салігорска, дзе некаторыя аўтамабілі былі затоплены ажно да ветравога шкла.**

— У Брэсцкай вобласці пацярпела 9 населеных пунктаў у 4 раёнах. Пашкоджаны дахі на 3 жылых і 21 сельскагаспадарчым будынку, — паведамілі **ў прэс-службе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.** — Усяго моцны вецер паваліў 18 дрэў — 6 у Брэсцкай, 7 у Гродзенскай і 5 — у Магілёўскай абласцях. На Гродзеншчыне было падтоплена 13 прыватных дамоў, а ў Ваўкавыскім раёне блізу вёскі Новае Сяло размыла дарогу.



Да таго ж непагадзь часова пакінула без электрычнасці 333 населеныя пункты. У час навальніцы на Брэстчыне загарэліся тры гаспадарчых пабудовы. Мяркуецца, што іх падпаліла маланка. А ў Пінскім раёне вецер сарваў дахі з 13 малочнатаварных фермаў. Па прагнозах сіноптыкаў, ветранае надвор'е з дажджамі захаваецца да выхадных.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## ІНФЛЯЦЫЯ Ў ЧЭРВЕНІ СКЛАЛА 0,7%

**Пра тое, што цэны ў мінулым месяцы выраслі нязначна, паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт. Спецыялісты гэтага ведамства канстатуюць, што прадукты за першы месяц лета падаражэлі на 1,3%, паслугі — на 0,7%, а кошты на непрадуктовыя тавары паменшыліся на 0,12%.**

Асобна ў харчаванні адзначыліся агароднiна і бульба. Агароднiна паднялася ў кошце на 14,91%, дзе больш за ўсё падаражэлі свежая белакачанная капуста — на 66,63%, морква — на 25,87% і буракі — на 16,63%. Пры гэтым патаннелі свежыя агуркі і памідоры (на 19,86% і 10,06% адпаведна). Бульба падаражэла на 35,46%. Патаннелі мяса і мясапрадукты на 0,19% (курыца, кураняты, уключаючы бройлераў, — на 1,31%), рыба і рыбапрадукты (уключаючы морапрадукты) — на 0,06%, курыныя яйкі — на 2,99%, кава — на 0,44%. Ужо традыцыйна падаражэў алкаголь на 0,27%, а цыгарэты — на 0,45%.

Другі месяц запар назіраецца падзенне коштаў на нехарчовыя тавары. Адзенне патаннела на 0,92%, абутак — на 1,01%. Аднак мэбля стала даражэйшая на 0,03%, электратавары — на 0,1%. За мінулы месяц падаражэлі паслугі — на 0,74%. Паслугі дашкольных устаноў падняліся ў кошце на 9,77%, чыгуначнага транспарту — на 7,54%. Санаторна-аздараўленчыя паслугі падаражэлі на 6,91%, турпаслугі — на 3,34%.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ДЗВЕ БУТЭЛЬКІ — І ЗА РУЛЬ

**У Брэсце зафіксаваны чарговы сумны рэкорд. 31-гадовага вадзіцеля затрымалі пры кіраванні машынай у п'яным выглядзе. Медыцынскае асведчанне выявіла 4,36 праміле алкаголю. Такой дозы ап'янення яшчэ не было выяўлена ў вадзіцеляў транспартных сродкаў, прынамсі сёлета.**

Патрульны нарад аўтаінспекцыі звярнуў увагу на машыну, якая няўстойліва рухалася па вуліцы Прамысловай прыгараднай вёскі Тэльмы-2, паведамілі ў прэс-службе Брэсцкага абласнога ўпраўлення ДАІ. Інспектары падалі сігнал спыніцца, пасля чаго сумненняў у іх не засталося: шафёр быў моцна п'яны. Ён растлумачыў, што вяртаўся пасля святкавання дня нараджэння калегі. А чаму так дрэнна зрабіў саслужывец, што адправіў таварыша дадому ў п'яным выглядзе за рулём, застаецца нявысветленым. Зразумела адно, што адказваць нядбайнаму вадзіцелю давядзецца, як той казаў, па поўнай праграме. Тым больш што за аналагічнае правапарушэнне ён ужо быў аштрафаваны ў 2011 годзе.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ПРАЗ МЯЖУ — БЯГОМ!

**Адзіны ў Еўропе трансгранічны марафон «Гродна—Друскінінкай» сёмы раз сабраў бегуноў з 15-ці краін свету.**

Сёлета рамкі значна пашырыліся. У спаборніцтве прынялі ўдзел прадстаўнікі Польшчы, Літвы, Латвіі, ЗША, Германіі, Украіны, Англіі, Чэхіі, Нарвегіі, Расіі і іншых краін. Многія спартсмены не першы раз удзельнічаюць у марафоне. Дарэчы, гэты прабег не толькі для прафесійных бегуноў, але і для ўсіх аматараў актыўнага ладу жыцця. Сёлета набралася больш за 140 «марафонцаў», што на траціну больш, чым раней. Начальнік упраўлення спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама Алег Андрэйчык, сам актыўны ўдзельнік прабегу, тлумачыць узросшы інтарэс дзеяннем бязвізавага рэжыму на тэрыторыі парка «Аўгустоўскі канал», у зону якога ўваходзіць і траса маршруту.

Ідэя прабегу ўзнікла невыпадкова. Неяк у спартыўным асяроддзі заўважылі, што адлегласць паміж беларускім Гродна і літоўскім горадам-пабрацімам Друскінінкай складае тую самую марафонскую дыстанцыю ў 42 км 195 м. Вось і вырашылі гэту асаблівасць замацаваць сяброўскім забегам. З тае пары мінула сем гадоў, а марафон «Гродна—Друскінінкай» толькі набірае абароты.

Самым хуткім на трасе быў Юрый Капцяроў з Магілёва (2 гадзіны 28 хвілін), а сярод жанчын перамагла Алена Шумік (3 гадзіны 7 хвілін) з Брэста.

**Маргарыта УШКЕВІЧ**

■

■ Карыснае лета

# БАЙЦЫ БУДАЎНІЧАГА ФРОНТУ

**Трэці працоўны семестр афіцыйна адкрыўся на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі ў Астраўцы**




Фота Надзеі БУЖАН.

Без гітарыстаў у будатрадзе не абысціся.

Падчас цырымоніі студэнты зводнага беларуска-расійскага студэнцкага атрада імя двойчы Героя Савецкага Саюза, маршала Мікалая Крылова атрымалі сімвалічныя працоўныя пуцёўкі, паўдзельнічалі ў «Адкрытым дыялогу» на тэму «Моладзь будуе Саюз», а таксама правялі майстар-класы для прысутных на аб'ектах Беларускай атамнай электрастанцыі, якія ўзводзяцца. Усяго сёлета ў Астраўцы будзе працаваць 278 байцоў. Гэта дванаццаць лінейных атрадаў, сфарміраваных на базе ўстаноў адукацыі з усіх рэгіёнаў Беларусі, і тры лінейныя атрады з профільных навучальных устаноў Расіі.

## Трапляюць толькі найлепшыя

Будоўля ў Астраўцы мае статус усебеларускай не выпадкова — сёлета тут будуць прадстаўлены навучальныя ўстановы з усіх без выключэння рэгіёнаў краіны. У Брэсцкай вобласці гэта Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, у Віцебскай — Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, у Гомельскай — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту, у Гродзенскай — Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы і яго філіял Лідскі каледж, у Магілёўскай — Беларуска-Расійскі ўніверсітэт. Сталіца прадстаўлена Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэтам, Беларускім дзяржаўным універсітэтам інфарматыкі і радыёэлектронікі, Мінскім дзяржаўным энергетычным каледжам. Расіяне прыехалі з Обнінскага інстытута атамнай энергетыкі, Нацыянальнага даследчага ядзернага ўніверсітэта «МІФІ», што ў Маскве, Ніжагародскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта і Маскоўскага дзяржаўнага будаўнічага ўніверсітэта.

Як сцвярджаюць арганізатары са Штаба працоўных спраў БРСМ, падбор байцоў для работы на Усебеларускай маладзёжнай будоўлі праходзіў на конкурснай аснове. Улічваліся ўзрост кандыдатаў, паспяховасць навучання, здароўе, наяўнасць будаўнічай спецыяльнасці не ніжэй за 2—3 разрад, актыўная жыццёвая пазіцыя. Самымі запатрабаванымі на будоўлі сталі прафесіі муляра, бетоншчыка, арматуршчыка-бетоншчыка, цесляра-бетоншчыка, геадэзіста, маляра. Дарэчы, працуюць байцы не толькі непасрэдна на АЭС. Яны дапамагаюць ствараць інфраструктуру і ў самім горадзе: узводзяць жылыя дамы, новую бальніцу. Частка студэнтаў шчыруе нават на мытні. Усе папярэдне прайшлі навучанне і стажыроўкі па сваіх відах работ у Вучэбным цэнтры Беларускай АЭС.

— Я ў студэнцкім атрадзе ўпершыню, — дзеліцца **навучэнец Лідскага каледжа, баец атрада «Маналіт» Яўген КАРПЯНКОЎ.** — Вельмі хацеў паехаць менавіта ў Астравец, але гэта было няпроста, бо ўсе ахвотныя праходзілі даволі складаны адбор. Для мяне паездка ў першую чаргу стане вельмі карысным досведам, бо ўбачыць такую вялікую будоўлю «з сярэдзіны» ўдаецца далёка не кожнаму. Акрамя таго, цікава будзе пазнаёміцца з байцамі з іншых рэгіёнаў Беларусі, а таксама расійскімі студэнтамі. Не буду хаваць, заробак таксама не на апошнім месцы.

## І праца, і традыцыі

Усіх байцоў засялілі ў «інтэрнат» — па сутнасці, звычайны новы жылы дом у Астраўцы. Усе кватэры абсталяваны бытавой тэхнікай, гаспадарчымі прыладамі. Аплачваюць пражыванне арганізацыі-наймальнікі. Студэнты абедаюць у сталовых на тэрыторыі БелАЭС, а вось снедаюць і вячэраюць усе за ўласныя сродкі. Гэта павінен кампенсаваць немалы па мерках студэнцкіх атрадаў заробак — паводле слоў арганізатараў, у сярэднім байцы атрымаюць па 500 рублёў за месяц.

— Да ўдзелу студэнтаў у будаўніцтве аб'ектаў БелАЭС у мяне самае станоўчае стаўленне, — расказвае **генеральны дырэктар РУП «Беларуская атамная электрастанцыя» Міхаіл ФІЛІМОНАЎ.** — Лічу, што яны акажуць нам вялікую дапамогу. Памятаю сябе ў якасці байца будатрада, мы аддаваліся рабоце поўнасцю. Ды і па досведзе папярэдніх гадоў бачу, як яны ўплываюць на іншых, — заводзяцца самі і калег падштурхоўваюць. Таму нічога, акрамя пазітыву, я ад студэнтаў не чакаю. Яны могуць выконваць усе будаўнічыя работы, але робіцца гэта толькі пад наглядам больш дасведчаных будаўнікоў.

У вольны ад работы час для байцоў будзе арганізавана насычаная забаўляльная праграма. Спартакіяда, кубкі па валейболе і стрытболе, турніры па міні-футболе, настольным тэнісе, шахматах, спартыўна-інтэлектуальны квэст «Жывы студатрадам», інтэлектуальная гульня «Што? Дзе? Калі?» і «Science Quiz», конкурсы цалінных лагераў, студатрадаўскіх касак, фотакрос «У аб'ектыве студатрад», працоўныя дэсанты, экскурсіі — вось далёка не поўны спіс мерапрыемстваў, што запланаваны для будатрадаўцаў да канца жніўня. Скончыцца работа Усебеларускай маладзёжнай будоўлі падвядзеннем вынікаў: узнагароджаннем найлепшых беларускіх і расійскіх атрадаў, якія вызначаць паводле працоўных паказчыкаў, і ўрачыстым закрыццём.

— Мы ўжо чацвёрты год збіраемся на гэтай пляцоўцы, і ўвесь час бачым, як будуецца наша АЭС, — сказаў на цырымоніі адкрыцця **першы сакратар ЦК БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ.** — Знаходзячыся тут, я адчуваю гонар за нашу краіну, за тое, што мы больш як дваццаць гадоў паспяхова будуем незалежную Беларусь, што застаёмся сябрамі з братняй Расіяй. Разам мы ствараем нашу будучыню, і менавіта моладзь сваім шчыраваннем даказвае, што мае правільныя прыярытэты: праца і сяброўства. Гэта вялікае дасягненне студатрадаўскага руху, які мы здолелі захаваць. Упэўнены, што аб'ект, які мы ўзводзім, будзе яшчэ адным прадметам нашага гонару.

## Галоўная каштоўнасць — досвед

На другім энергаблоку беларускія студэнты шчыруюць у будучай машыннай зале. Хутка тут усталююць турбіну, якая і будзе выпрацоўваць электрычнасць, пакуль жа работа ідзе літаральна пад адкрытым небам.

— Мы займаемся геадэзічнымі работамі — замяраем адлегласць паміж канструкцыямі, правяраем адпаведнасць праекту, — тлумачыць **студэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту, што ў Гомелі, Аляксандр КІСЯЛЁЎ.** — Для мяне галоўная перавага студатрадаў заключаецца ў досведзе, які тут можна атрымаць. Ва ўніверсітэце шмат тэорыі, а вось практыкі не стае. Першае, што тут кідаецца ў вочы, — вялікая ўвага ахове працы. А яшчэ падабаецца, што старэйшыя рабочыя, што называецца, «носу не задзіраюць», — усё нам тлумачаць, ахвотна дапамагаюць. Стаўленне да нас самае сур'ёзнае, гэта не можа не радаваць.

Зусім побач узводзіцца будынак рэактара. Працуюць тут ужо расійскія студэнты з профільных ВНУ. Яны дапамагаюць вязаць 40-міліметровую арматуру, якую дастаўляюць на вышыню ва ўжо сагнутым выглядзе. Разаграваць і згінаць яе нельга — гэта можа парушыць трываласць металу. Пазней канструкцыю зальюць бетонам, а ўжо ў жніўні на другі энергаблок даставяць корпус рэактара, пасля чаго пачнецца яго ўстаноўка.

— Працую тут ужо практычна тыдзень, ніякіх складанасцяў няма, — кажа **студэнт маскоўскага Нацыянальнага даследчага ядзернага ўніверсітэта «МІФІ»Станіслаў АНДРЭЕЎ.** — Увогуле, не баюся фізічнай працы, ды і арміраванне для мяне — не новая справа. Я разглядаў некалькі варыянтаў, куды мог бы паехаць. Напрыклад, была магчымасць трапіць на АЭС у Азёрску. Але там працуе ўсяго адзін атрад — гэта не вельмі цікава. Таму вырашыў прыехаць у Беларусь. Усяго ў атрадзе нас 24 чалавекі, усе з розных курсаў і спецыяльнасцяў. Пасля выпуску буду займацца эксплуатацыяй АЭС, таму для мяне гэта неверагодна каштоўны досвед. У Астраўцы мне падабаецца — горад невялікі, але вельмі зручны і прыгожы. Калі будзе магчымасць вярнуцца ў Беларусь, абавязкова гэта зраблю.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*



Студэнты з Гомеля працуюць на будоўлі геадэзістамі.


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж», г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, 3-й этаж<br>Тел: +375 17 256 90 12, +375 17 256 90 01 |

**Предмет аукциона**
Имущество, в составе объектов недвижимости, оборудования и сооружений, реализуемое одним лотом, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, д. 254

| Наименование | Назначение | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|---|
| **Здание АБК с цехом по производству металлоконструкций** | Здание многофункциональное | 3030,0 кв. м | 350/С-88086 |
| Составные части и принадлежности: пристройка, тамбур, беседка, забор, ворота (2 шт.), отмостка, проезжая часть, бордюр к проезжей части, бетонная площадка, тротуар | | | |
| Ограничение (обременение): договор аренды сроком до 31.05.2018 г. | | | |
| **Здание не отапливаемого материального склада** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 947,6 кв. м | 350/С-88082 |
| Составные части и принадлежности: пристройка, пандус, сарай | | | |
| Ограничение (обременение): договор аренды сроком до 02.01.2019 г. | | | |
| **Здание мастерской техобслуживания** | Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции | 764,5 кв. м | 350/С-88090 |
| Составные части и принадлежности: пристройка, сарай | | | |
| Ограничение (обременение): договор аренды сроком до 31.05.2018 г. | | | |
| **Здание проходной** | Здание неустановленного назначения | 8,7 кв. м | 350/С-88091 |
| **Канализационно-насосная станция** | Здание специализированное коммунального хозяйства | 31,9 кв. м | 350/С-88092 |
| Составные части и принадлежности: подвал, крыльца | | | |
| **Здание трансформаторной подстанции** | Здание специализированное энергетики | 40,1 кв. м | 350/С-88094 |
| Составные части и принадлежности: отмостка | | | |
| **Здание теплопункта** | Здание специализированное энергетики | 42,9 кв. м | 350/С-88096 |
| Составные части и принадлежности: отмостка | | | |
| Ограничение (обременение): договор аренды открытой площадки для стоянки автомобильной техники до 02.01.2019 г. | | | |

**Сооружения, входящие в состав лота:**

| Наименование | Инв. № | Наименование | Инв. № |
|---|---|---|---|
| Навес для хранения кислородных баллонов (17,5 кв. м) | 0006970 | Тепловые сети (200 м) | 17 |
| Навес для хранения газовых баллонов (28,2 кв. м) | 0012717 | Канализационные сети (200 м) | 150000 |
| Металлическая эстакада №1 (1,4 т) | 0014321 | Водопроводные сети (5 км) | 16 |
| Металлическая эстакада №2 (1,9 т) | 0014322 | Телефонный кабель (4 км) | 13 |
| Очистные сооружения объемом отстойника – 380 куб. м | 9 | Низко-высоковольтные сети (АВВГ 655 м. п. и АВВГ 80 м. п.) | 14 |
| Вышка осветительная (25,0 м. п.) | 150155 | Телефонизационные сети | 8 |
| Открытый склад металла (склад №1 – подкрановые пути 187 м.п., ж/б площадки 5425кв.м.; склад №2 – крановая эстакада, бетонное покрытие 864 кв. м) | 7 | Кабель марка кабеля ААШВ 3*120 длина 1,62 км. | 133000 |
| Кабель 10 кВт АСБ-3 *185 L=1,045 км | 132000 | Кабель 6 кВт 3*120, L=0,6 км | 131000 |
| Многолетние насаждения в количестве 111 ед., инв. №150119 – 150122 | | | |

**Оборудование, входящее в состав лота:**

| Наименование | Инв.№ | Наименование | Инв.№ |
|---|---|---|---|
| кран подвесной Эл-32 | 729 | кран козловой консольный 20 тн. | 920 |
| кран подвесной Эл-2 | 728 | электрическая кран-балка подвесная | 706 |
| кран-балка | 622 | | |

**Материалы, входящие в состав лота: железобетонные конструкции (340 тн)**

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке:** | Земельный участок общ. пл. 3,7412 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации производственной базы. |

**Начальная цена с НДС 20 %: 1 546 066,90 белорусских рублей BYN**
**Шаг аукциона: 77 303,35 белорусских рублей BYN**

**Порядок ознакомления:** Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00.
Ответственные лица: Рабкевич Сергей Геннадьевич, директор филиала СУ-118, контактные телефоны: +375 44 765 26 94, +375 232 46 09 00
Дриневский Виктор Васильевич, производитель работ филиала СУ-118, контактные телефоны: +375 29 603 49 02, +375 232 46 09 03.

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** www.cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона.

**Срок оплаты:** не более 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %.

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

Предыдущее извещение о проведении аукциона было опубликовано в г. «Звязда» 29.06.2017 г.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **26.07.2017** в 10.30 по адресу: **г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, 3-й этаж, ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж».** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **24.07.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Контактные телефоны:** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.<br>Email: auction@cpo.by |

Сямейная газета

Выпуск №13 (80)



## ЦУДЗІК І ЦУДЫ

Прачытала нядаўна кнігу Свэна Нурдквіста «Пэтсан сумуе». Яна пра тое, як знаходлівы кот Фіндус спрабаваў развесяліць любімага гаспадара. І ўспомніла сваіх двух вусатых ратавальнікаў.

У дзяцінстве бацькі чамусьці забаранялі мне заводзіць хатніх жывёл. Але, нягледзячы на забароны, я ўсё адно прынесла дадому маленькае кацяня. Калі мама з татам пачулі, што сусед хацеў закапаць гэты шэранькі клубочак, дазволілі яго пакінуць. Праз год я з краснухай трапіла ў бальніцу. Ніколі не забудуся, як мама патэлефанавала мне ранкам і сказала праз слёзы радасці: «Твая Мурза выратавала нам жыццё».

Узімку, перад тым як класціся спаць, мы зачынялі кошку на кухні. У тую злашчасную ноч яна так гучна і доўга мяўкала, што бацькі прачнуліся, выбеглі ў качагарку, а там — агонь. Ён, на шчасце, яшчэ не паспеў разгарэцца, таму ўдалося папярэдзіць бяду.

Пасля таго як Мурзы не стала, я яшчэ доўга не наважвалася завесці новага сябра. Але чатыры гады таму лёс падарыў мне Цудзіка. Рудое кацяня хтосьці хацеў утапіць у Свіслачы. Гэтым разам маленькі камячок выратаваў ад смерці знаёмы. Коціку зусім не было дзе жыць, і я забрала яго да сябе. Але гарадская кватэра аказалася не самым добрым месцам для Цудзіка. У чатырох сценах яму не было куды дзяваць сваю энергію. Менавіта з-за гэтага часам паводзіў сябе даволі агрэсіўна: мог падрапаць маіх гасцей, перагрыз усе падзарадкі і навушнікі.

У канцы вясны мы з мужам адвезлі Цудзіка ў вёску. Бацькі пагадзіліся прыглядзець ката падчас нашага адпачынку. Калі вярнуліся, не пазналі ні Цудзіка, ні бацькоў. Тата — не аматар гаварыць па тэлефоне — расказваў мне пра прыгоды коціка як мінімум хвілін 15. «Ён з мамай ходзіць у поле. Чакае, пакуль яна падоіць карову. А пасля вяртаецца разам з ёй назад. А бачыла б ты, як смешна Цуд носіцца па двары за вераб'ямі! А калі хоча зайсці ў хату, становіцца на заднія лапы і грукае ў дзверы. Ён ужо зусім не агрэсіўны. Скача на калені ды лашчыцца, просіць, каб пагладзілі. А ўчора зранку ўпершыню прыйшоў да нас у ложак, прымасціўся каля ног ды варкатаў. Ведаеш, па-мойму, яму тут лепш». І зноў коцік, гэтым разам Цудзік, здзейсніў цуд. Бацькі павесялелі. Калі раней на пытанне "як справы?», чула ў адказ «усё па-старому», то цяпер кожны дзень у іх нейкія прыгоды.

Як бачыце, дабро заўсёды вяртаецца. І рана ці позна гэта разумеюць усе.

Адзінокая жанчына кожную раніцу пякла дзве аладкі. Адну для сябе, другую для выпадковага мінака. Апошнюю заўсёды клала на падаконнік і пры гэтым малілася за свайго сына, які пайшоў шукаць лепшую долю. На працягу многіх месяцаў маці нічога не ведала пра яго. Кожны дзень аладку з падаконніка забіраў адзін і той жа гарбун. Але замест слоў падзякі, ён толькі мармытаў: «Зло, якое вы робіце, застаецца з вамі, а дабро вяртаецца вам!» Не атрымліваючы чаканых слоў падзякі, жанчына адчувала сабе яшчэ больш няшчаснай. Аднойчы яна вырашыла пазбавіцца ад няўдзячнага гарбуна. І дадала атруту ў яго аладку. Ужо сабралася пакласці яе на падаконнік, але ў галаве пранеслася думка: «Што ж я раблю?» Жанчына дрыготкімі рукамі кінула атрутную аладку ў агонь. Хуценька прыгатавала іншую і паклала яе на падаконнік. Гарбун, як звычайна, узяў аладку, прамармытаўшы нязменнае: «Зло, якое вы робіце, застаецца з вамі, а дабро вяртаецца вам!» і працягнуў свой шлях. У той жа вечар нехта пагрукаў у дзверы. На парозе жанчына ўбачыла свайго сына — худога, знясіленага, у лахманах. «Мама, гэта проста цуд, што я тут! Я быў ад дома ўсяго толькі на адлегласці адной мілі, калі ледзь не страціў прытомнасць ад голаду. І, напэўна, памёр бы, але менавіта тады нейкі стары гарбун аддаў мне сваю аладку. Сказаў: «Гэта мая адзіная ежа на цэлы дзень, але бачу, што ты маеш у ёй большую патрэбу, чым я». Жанчына збялела і прытулілася да дзвярэй, каб не ўпасці. Цяпер яна зразумела, што меў на ўвазе гарбун, калі казаў: «Зло, якое вы робіце, застаецца з вамі, а дабро вяртаецца вам!»

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

■ Вам і не снілася

# КАХАННЕ І АРЫГАМІ

## ЯК ПАПЯРОВЫЯ ФІГУРКІ ДАПАМАГЛІ СТВАРЫЦЬ СЯМ'Ю



Фота Надзеі БУЖАН.

**Гісторыю кахання свайго сябра расказаў двухразовы чэмпіён свету па арыгамі Дзмітрый ЛЫСЮК.**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

■ Ну і ну!

# ФОТАСЕСІЯ Ў ПАДАРУНАК

## Сёстры-блізняты з Бразіліі незвычайна адзначылі сваё 100-годдзе

**Пра 100-гадовых блізнят Марыю і Паўліну 28-гадовая фатограф Каміла Ліма даведалася зусім выпадкова. Не доўга думаючы, яна прапанавала ім прыняць удзел у рамантычнай фотасесіі. Бабулі ахвотна пагадзіліся. Як паведаміў тэлеканал ABC, здымкі доўжыліся дзве гадзіны.**

З блізнятамі таксама працаваў стыліст. Ён падабраў для Марыі і Паўліны адзенне (лёгкія спадніцы-пачкі ружовага і блакітнага колеру і аднолькавыя майкі з лічбай 100) і зрабіў някідкі макіяж.

— Сёстры зрабілі ўсё, што мы задумалі, і не скардзіліся на стомленасць. Яны былі вельмі задаволеныя і выглядалі шчаслівымі, — расказала Ліма.

Па словах фатографа, яна рэгулярна здымае пажылыя пары ў тым ліку для таго, каб натхніць маладых людзей на стварэнне моцных сем'яў.

Дарэчы, у кожнай з блізнят шмат сваякоў. У Паўліны шасцёра дзяцей, 19 унукаў і 16 праўнукаў, а ў Марыі — пяцёра дзяцей, 12 унукаў і сем праўнукаў ■



■ Пераходны ўзрост

## Андрэй ЖВАЛЕЎСКІ і Яўгенія ПАСТЭРНАК:

# «ДЗЯЦЕЙ ТРЭБА ПАВАЖАЦЬ»

**Каму лепш за ўсіх разумець падлеткаў, як ні пісьменнікам, якія ствараюць для іх кнігі? Андрэй ЖВАЛЕЎСКІ і Яўгенія ПАСТЭРНАК вядомы беларускім школьнікам як аўтары аповесцяў «Час заўсёды добры», «Гімназія №13», «Пакуль я на краі». Яны таксама вядуць сайт forteen.info — у дапамогу татам і мамам падлеткаў. А яшчэ Андрэй і Яўгенія самі бацькі, якія не па чутках ведаюць пра ўсе нюансы пераходнага ўзросту. У інтэрв'ю гутарым з пісьменнікамі пра спісы літаратуры на лета, бяспеку ў інтэрнэце, дзяцей, якія чытаюць, і дарослых, якія любяць дыктаваць, як жыць.**



### Спіс літаратуры на лета для... мамы і таты

**Так-так, мы не памыліліся. Разам з пісьменнікамі мы склалі невялікую падборку таго, што будзе карысна пачытаць (і паглядзець) бацькам падлеткаў.**

**1. Калонка піцерскага псіхолага Кацярыны Мурашовай у анлайн-часопісе «Сноб».**

**2. Відэа-канал «Мама дарагая! Быць бацькам падлетка» на сайце www.psychologies.ru.**

**3. Пачытайце тое, што чытае ваша дзіця. «Многае зразумееце пра яго. Галоўнае — ніякіх каментарыяў, — раяць пісьменнікі. — Калі спадабалася, скажыце, за што, калі не — проста маўчыце».**

## «Спісы літаратуры вельмі аднастайныя»

***— Канікулы ў разгары. Ні адно школьнае лета не абыходзіцца без абавязковых спісаў літаратуры. Як ставіцеся да іх?***

**Андрэй:** Вось калі з іх прыбраць слова «абавязковы», то чаму не?

**Яўгенія:** Насамрэч нічога страшнага ў спісах няма, акрамя таго што яны вельмі аднастайныя. На мой погляд, там павінна быць, напрыклад, 200 найменняў, з якіх дзіця выбера для сябе тое, што яму хочацца.

**Андрэй:** Згодны. Бо дзеці розныя.

**Яўгенія:** Ёсць настаўнікі, якія даюць спіс таго, што будуць праходзіць у наступным класе. Яны лічаць, што потым на працягу навучальнага года дзеці прачытаць гэта не паспеюць. Па мне, гэта няправільна, таму што летам трэба чытаць для задавальнення. Вельмі выбраныя вучні здольныя прачытаць Грыбаедава для душы.

**«Наконт кнігі пра спайсы нам нарколагі раілі: «Вы дарма ставіце 12+, трэба 6+». Фарміраваць адносіны да наркотыкаў трэба, пакуль гэта не стала балючай тэмай».**

Я давала б спіс, каб паказаць, наколькі цяпер багатая і рознабаковая літаратура. Калі ў нашым дзяцінстве для падлеткаў можна было налічыць сто-дзвесце найменняў, то цяпер іх тысячы. Школьнікі арыентуюцца ў гэтым моры літаратуры нашмат лепш за дарослых. Я праводзіла апытанні сярод падлеткаў: яны чытаюць столькі, што ты потым сядзіш і гугліш паўдня. Бо толькі трэць з таго, што называюць, я ведаю — гэта з улікам таго, што я добра знаёма з сучаснай літаратурай.

***— Чаму сучасным школьнікам «не заходзіць» класіка?***

**Яўгенія:** Таму што з часу напісання тых твораў ужо не адна эпоха змянілася. Магу пра свой вопыт расказаць. З малодшай дачкой я чытала класіку ўслых. У пятым класе гэта было жудасна. Мы селі чытаць «Муму», і дачка з планшэтам гуглiла ўсе незразумелыя словы. А там жа яшчэ сітуацыі незразумелыя. У выніку кожны класічны твор перацякаў ва ўрок па гісторыі. І на адно апавяданне ішоў тыдзень.

**Андрэй:** Другая праблема — гэта насілле. Калі я падлетак і мне кажуць надзець шапку, я яе не надзену, нават калі на вуліцы мінус 30. З класічнай літаратурай тое ж самае. Гэта на ўзроўні анекдота. Хлопчыку паказваюць нашу кнігу, ён глядзіць: «Пастэрнак? Школьная праграма? Не адкрыю!»

***— Як прывучыць дзяцей чытаць?***

**Яўгенія:** Толькі асабістым прыкладам — іншых спосабаў няма. Выдатна, калі трапляецца на шляху добры бібліятэкар ці настаўнік мовы і літаратуры. Але гэта хутчэй выключэнне — каб у нечытаючай сям'і вырасла чытаючае дзіця.

**Андрэй:** Мая сярэдняя дачка часта ходзіць у бібліятэку і вяртаецца з вялікім стосікам кніг. 80 працэнтаў гэтай кіпы — дэтэктывы і масавая літаратура. Але 2—3 кнігі — ваў! Іх у бібліятэцы, што называецца, падсоўваюць.

**Яўгенія:** Падлеткі цяпер капрызныя. Усе гэтыя заходы бацькоў — «вось я ў дзяцінстве чытаў "Тома Соера", выдатная кніжка!» — не праходзяць. Калі вы прапанавалі падлетку кніжку, а ён сказаў, што не можа яе адолець, значыць, вы не тое прапанавалі. Трэба ісці ў бібліятэку, шукаць. Гэта праца.

## «Кніга не можа давесці да самагубства»

***— Апошнія вашы творы закранаюць няпростыя пытанні: суіцыды, наркотыкі. Не баяліся ўздымаць складаныя тэмы? Наколькі гэта кніжная размова?***

**Андрэй:** Мы баяліся нашкодзіць. Таму складаныя тэмы заўсёды абмяркоўваем з псіхолагамі і паказваем ім тэкст. І толькі пасля іх адабрэння друкуем. Вядома, на такія тэмы лепш размаўляць у сям'і. Але кніга можа стаць падставай для гэтага. Вось вы баіцеся пагаварыць пра суіцыды — а давайце прачытаем кніжку. Мы ж не пра цябе цяпер, а пра нейкіх герояў.

Наконт кнігі пра спайсы нам нарколагі раілі: «Вы дарма ставіце 12+, трэба 6+». Фарміраваць адносіны да наркотыкаў трэба, пакуль гэта не стала балючай тэмай. І тады ў 12—14 гадоў, калі яны раптам аказваюцца побач з дзецьмі (а яны аказваюцца ў любой, нават самай прыстойнай гімназіі), у чалавека будзе ўжо сфарміравана меркаванне.

***— Бачыла статыстыку, што ў падлеткаў вельмі папулярныя творы пра суіцыды...***

**Яўгенія:** У нас, дарэчы, аповесць «Пакуль я на краі» менавіта з гэтага нарадзілася. Я тады прааналізавала дваццатку самых папулярных кніжак, якія спампоўваюць, і высвятліла, што 17 з іх заканчваюцца (ці пачынаюцца) суіцыдам. Для мяне гэта было ўзрушэнне: чаму? Але мне вельмі хутка растлумачылі: расслабся, так было заўсёды.

**Андрэй:** Успомніце літаратуру канца XVIII стагоддзя. Сентыменталізм увесь заканчваецца самазабойствамі.

**Яўгенія:** Падлеткавыя бунты і, у клінічным выпадку, суіцыды — гэта ўвогуле не пра смерць. Дзеці не разумеюць, што гэта канец.

**Андрэй:** Ім трэба, так бы мовіць, сімвалічна памерці. Падлеткі ўпэўнены, што пасля пачнецца нешта іншае.

**«Калі ты не гатовы да размовы, трэба растлумачыць: праз пяць хвілін адкажу, мне неабходна падумаць. Ні ў якім разе не крычаць: «Што за жах ты ў мяне пытаеш?! Дзе ты набраўся такіх слоў?»**

***— Некаторыя бацькі ў водгуках на кнігу пішуць: маўляў, ні за што дачцэ не дам чытаць пра суіцыды.***

**Яўгенія:** Гэта іх права. Але калі б людзі маглі скончыць жыццё самагубствам, прачытаўшы кнігу, усё чалавецтва ўжо б памерла.

**Андрэй:** Гэта датычыцца і інтэрнэту. Псіхолагі ўжо адкрытым тэкстам кажуць: у сеціве давесці да самагубства немагчыма. Няма такіх механізмаў. Падштурхнуць — можна. Але толькі гатовага да гэтага чалавека. Яго падштурхнуць можа нават карціна Фядотава.

## «Калі прысутнічае гіперкантроль, пачынаецца хлусня»

***— Вы праводзіце семінары на тэму бяспекі ў інтэрнэце. Падзяліцеся, як абараніць дзіця ў сеціве?***

**Яўгенія:** Ніякія знешнія фільтры не працуюць. Якраз сёння чытала выдатны артыкул. «Ты гісторыю браўзера чысціш?» — пытаецца ў падлетка карэспандэнт. «Не, навошта? — адказвае той. — Я ўсё дрэннае раблю з тэлефона». Немагчыма адсачыць, што яны глядзяць.

Фільтр павінен быць у дзіцяці ўнутры. Я са сваёй дачкой вельмі шмат на тэму паводзін у інтэрнэце размаўляю. Ёсць нейкія базавыя рэчы, якія падлеткі для сваёй бяспекі павінны ведаць абавязкова. Ніколі не выкладаць далікатныя фатаграфіі. Асабліва дзяўчат датычыцца. Столькі гісторый потым бывае, калі дзяцей пачынаюць шантажыраваць. Трэба тлумачыць, што нават калі ты выклаў фотаздымак у асабістай перапісцы — лічы, павесіў на агароджы. Усе так званыя гарачыя чаты, якія цяпер існуюць, небяспечныя.

**Андрэй:** А самае галоўнае — нашы дзеці вельмі чыстыя, не сапсаваныя. З тымі ж фатаграфіямі прыходзіцца тлумачыць, як гэта ўспрымаецца. Мы нават напісалі апавяданне, дзе расказалі, што думаюць некаторыя мужчыны, калі глядзяць на юнае жаночае цела.

**Яўгенія:** Плюс меры бяспекі зусім эканамічныя. Не называць свой дамашні адрас, не даваць тэлефон, ніякіх звестак пра асабістае жыццё, інфармацыі, калі ты дома адзін. Гэта так жа важна, як навучыць дзіця пераходзіць дарогу.

**Андрэй:** У Аўстраліі добра зрабілі. Там правілы паводзін у інтэрнэце зачытваюць усім дзецям кожны год першага верасня пад роспіс.

***— Ці варта бацькам кантраляваць, колькі часу дзіця сядзіць у інтэрнэце?***

**Яўгенія:** На гэты конт ёсць выдатнае даследаванне псіхолага Кацярыны Мурашовай. Бацькоў падзялілі на тры групы. Першыя жорстка кантралявалі час, які падлетак праводзіць у інтэрнэце. Па іх словах, дзеці сядзелі ў сеціве па 7 гадзін на тыдзень. Другая група сачыла не так строга: яны лічылі, што іх сыны і дочкі праводзяць анлайн па 11 гадзін на тыдзень. Трэцяя група бацькоў не ўмешвалася, і іх дзеці, па ацэнцы дарослых, былі ў сеціве 25 гадзін на тыдзень. Па паказаннях саміх падлеткаў, школьнікі з першай групы сядзелі ў інтэрнэце 21 гадзіну на тыдзень, з другой і трэцяй — 24 гадзіны. Кантралюем мы ці не, гэта ніяк не ўплывае. Wi-Fi па горадзе валам — пайшоў у любы гандлёвы цэнтр, падключыўся і сядзі.

**Андрэй:** Чым дрэнны татальны кантроль? Ты губляеш кантакт з дзіцем. Падлетак уваходзіць у той узрост, калі яму патрэбны сакрэты, і ён натуральна пачынае загароджвацца. І ты можаш прапусціць нешта сур'ёзнае. А дзеці ў гэтым плане вельмі вынаходлівыя. Тату нешта не спадабалася ў профілі дзіцяці — хлопчык проста заводзіць другі. Калі прысутнічае гіперкантроль, пачынаецца хлусня.

## «Яны здзіўляюць сваёй мудрасцю»

***— Як бацькам лепш зразумець падлеткаў?***

**Яўгенія:** Варта размаўляць. Вельмі паказальная была гісторыя з блогерам Уладам Бумагам (на сустрэчу з ім прыйшло тры тысячы школьнікаў. — **Аўт.**): дарослыя даведаліся, што ў падлеткаў, аказваецца, ёсць свой свет. Добра быць у курсе, чым захапляецца тваё дзіця.

**Андрэй:** Кажуць: як, з гэтых падлеткаў нічога не выцягнеш! А не трэба нічога выцягваць — проста зацікаўлена слухайце. Не з пазіцыі «што ты мне лухту расказваеш, вось у наш час». Пасля першай жа такой размовы сцяна вырастае. Мы ж нашым падлеткам лекцыі чытаем, дыктуем, як жыць.

**«У Аўстраліі добра зрабілі. Там правілы паводзін у інтэрнэце зачытваюць усім дзецям кожны год першага верасня пад роспіс».**

Нас увесь час вучаць, што дзяцей трэба любіць. Але гэта бессэнсоўна: мы іх і так любім. Бацькоў трэба вучыць паважаць дзяцей. Разумець, што гэта іх права — выбіраць сабе кнігі, сяброў, блогераў. Успрымаць іх выбар без наезду, без спроб высмеяць. Тады дзеці да нас будуць цягнуцца, бо мы іх галоўны рэсурс. Калі за спінай сям'я, куды можна вярнуцца, бунт праходзіць спакайней.

***— Як самі наладжваеце кантакт з дзецьмі?***

**Андрэй:** У нас з сярэдняй дачкой ёсць такая забава — садзіцца гаварыць. Тэма можа быць любая. Галоўнае — размова на роўных. А яшчэ лепш што-небудзь разам рабіць. З малодшым сынам мы, напрыклад, «лега» збіраем.

**Яўгенія:** Абедзве мае дочкі дакладна ведаюць, што на любое пытанне атрымаюць адказ. Не ўяўляю, што ў мяне можна спытаць, каб «выбіць». Але калі ты не гатовы да размовы, трэба растлумачыць: праз пяць хвілін адкажу, мне неабходна падумаць. Ні ў якім разе не крычаць: «Што за жах ты ў мяне пытаеш?! Дзе ты набраўся такіх слоў?»

***— Прыслухоўваецеся да парадаў сваіх дзяцей?***

**Андрэй:** Яны даюць радыкальныя парады наконт кніг. Аднойчы Жэніна дачка нам тры месяцы работы загубіла *(усміхаецца)*. Далі прачытаць ёй першы варыянт «52 лютага». І пачулі: «Добра. А адбываецца што-небудзь будзе?» Выкінулі тэкст і нанова перапісалі.

**Яўгенія:** Дзеці здзіўляюць сваёй мудрасцю. Калі я дома «разыдуся», старэйшая кажа: «Мам, ты так не нервуйся, усё ж нармальна». І сапраўды. Спакайней стала ставіцца да некаторых рэчаў. Няўжо я сур'ёзна буду сварыцца на дзяцей за тое, што яны не ядуць за сталом?

**Андрэй:** Яны ўвесь час вучаць нейкім правільным адносінам да жыцця.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# МОЙ ПРАПРАДЗЕД — ВЕЛІКАН



Прапрадзед Паліны (яна трымае ў руках сваю даследчую работу) у школьным класе «дастае» галавою да столі.

**У дні летніх канікул не сціхаюць звонкія дзіцячыя галасы на двары і ў класах Барысаўскай сярэдняй школы №18. Тут дзейнічае летні аздараўленчы лагер. Адпачынак дапаўняюць цікавыя заняткі, спартыўныя гульні, сустрэчы. Адна з такіх сустрэч была прысвечаная сусветна вядомаму велікану Фёдару Махнову, а вяла рэй у разглядзе свайго радаводу праправнучка гіганта трэцякласніца Паліна Махнова.**

*«...боты з халявамі, якія яму ледзь дастаюць да кален, простаму смертнаму дастаюць да пояса, а 12-гадовы хлопчык можа памясціцца ў іх з галавой. Скрозь пярсцёнак, які велікан насіў на ўказальным пальцы, праходзіць сярэбраны рубель».*

(Пра Фёдара Махнова са старонкі адрыўнога календара 1905 года.)

Клас, у якім адзінаццацігадовая Паліна прэзентавала сваю вучнёўскую даследчую работу «Мой род, мая сям'я», упрыгожыў вялізны (да самай столі!) фотапартрэт у поўны рост яе вядомага продка.

— Стары фотаздымак беларускага волата, чый рост дасягаў 2 метраў 85 сантыметраў, мы павялічылі да сапраўдных памераў волата, — растлумачыла **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Вольга ВАВІЛАВА.** — Раму для партрэта дапамаглі зрабіць шэфы з мясцовага мясакамбіната — выканалі яе так, каб можна было складаць і зручна перавозіць. Знаёміць сучаснікаў з беларусам-веліканам XIX стагоддзя цяпер можна будзе паўсюды.

Фёдар Махноў нарадзіўся ў 1878 годзе недалёка ад Віцебска ў вясковай сям'і. Яго бацькі былі высокага росту, але да гігантаў ім было вельмі далёка. Да васьмі гадоў Фёдар рос звычайным хлопчыкам, але затым яго нібы падмянілі: хутка стаў дужым і надзвычайна высокім. Мясцовы памешчык забраў юнака працаваць на млын.

У 14-гадовым узросце рост Фёдара перавысіў два метры. Бацька заказаў кавалю новы вялізны ложак для сына. Усё лета майстар вырабляў заказ, а хлапец тым часам працягваў падрастаць. Неўзабаве абноўка была гатовая, але і яна на той час аказалася занадта маленькай.

Незвычайнага падлетка заўважыў замежны гаспадар перасоўнага цырка. Два гады Фёдар вывучаў цыркавое майстэрства, замежную мову. У 16 гадоў ён падпісаў кантракт і стаў сапраўдным артыстам цырка. Дзевяць гадоў працаваў ён на арэне, здзіўляючы публіку ростам і фізічнай сілай. Вельмі папулярным быў нумар, у якім Фёдар лежачы падымаў над сабою драўляную платформу з маленькім аркестрам.

У пачатку XX стагоддзя Махноў пакінуў цырк і вярнуўся на радзіму. На зробленыя грошы выкупіў у памешчыка зямлю і хату, пабраўся шлюбам з вясковай настаўніцай. Жонка гіганта таксама была не маленькага росту, але не вышэйшая за яго локаць.

Фёдар любіў падарожнічаць разам з жонкаю і дзецьмі. У сям'і захаваліся ўспаміны пра адну з такіх далёкіх вандровак. Беларускі гігант у Парыжы паспрачаўся з некалькімі гараджанамі. Паліцэйскія затрымалі Фёдара, але за краты пасадзіць не атрымалася: ні ў адну камеру ён не ўмяшчаўся.

Памёр Фёдар Махноў на радзіме ў выніку хранічных хвароб. Помнік на яго магіле блізу вёскі Касцюкі захаваўся па сёння, але прах гіганта знік — гэта заўважылі пасля Другой сусветнай вайны.

Такую цікавую прэзентацыю радаводу пачуў я ў барысаўскай школе. Унікальнасць гэтага матэрыялу не толькі ў біяграфічных звестках пра незвычайнага продка. Паліна Махнова разам з бацькамі і сваёй настаўніцай пачатковых класаў Наталляй Янковай прасачыла далейшы лёс усіх членаў сям'і. Разам яны сабралі цікавую статыстыку росту дарослых і дзяцей. Вучнёўская даследчая работа «Мой род, мая сям'я» атрымала высокую ацэнку на конкурсах у Беларусі і Расіі.

**Яўген ПЯСЕЦКІ,**
**фота аўтара.**




На архіўным фотаздымку Фёдар побач з людзьмі звычайнага росту.




Афіша цырка, дзе працаваў Фёдар Махноў, апавяшчала пра выступленні беларускага гіганта.

■ Жыццёвае

# ДОБРАЯ ШТУКА

— Ну, хто тут з краю, хто ў чарзе апошні? — цяжка апіраючыся на мыліцы і пры гэтым лагодна ўсміхаючыся, ад весніц у двор Васіля Прохарава ішоў-шкандыбаў сусед Мікалай Смоляк. Па-вясковаму яго ўсе звалі Мікалай Бязногі. Ён звяртаўся да двух мужчын-суседзяў у гадах і двух хлопчыкаў, якім было гадкоў па сем-восем. Тыя сядзелі на шырокай лаўцы каля палісадніка ў той самай чарзе. А перад імі на табурэтцы, укрыты пад самую бараду старой цыратай, — яшчэ адзін сусед. З машынкай для стрыжкі ў руках над яго галавой шчыраваў гаспадар. Мікалай Смоляк з палёгкай апусціўся на вольнае месца лаўкі, з якой мужчыны, што сядзелі на ёй, тут жа сагналі занятых гульнёй мальцоў.

Для ўсіх, хто сабраўся ў гэтым двары, карціна была знаёмая і звыклая: перад паходам у лазню ніясніцтва суседзі па вуліцы, што былі ўжо ў гадах, рэгулярна, у апошнюю суботу месяца, ішлі сюды стрыгчыся. Прыводзілі і сваіх унукаў, над якімі не патрэбна было асаблівa варажыць, а ўсяго толькі абчакрыжыць пад нуль, пакінуўшы спераду маленькі чубік. Дабірацца па гэту патрэбнасць на другі канец пасёлка, у так званы Дом быта, дзе, акрамя цырульні, былі размешчаны яшчэ швачная і шавецкая майстэрні, ім было не пад сілу і без усялякага задавальнення. А тут, у суседа, падчас чакання сваёй чаргі можна было адвесці душу: пачуць шмат цікавага ад іншых, падзяліцца ўласнымі навінамі. Да таго ж «свайму цырульніку» і плаціць не патрэбна было, хіба толькі пару мядзякоў суне яго дзецям на кіно.

Галоўная ж перавага гэтай «цырульні» была не ў тым, не ў другім, і не ў трэцім, а ў той самай машынцы, якой тут наводзілі прыгажосць на галовах. Машынка Васіля, па іх аднадушнай думцы, «не скубла». Гэта значыць, не рвала валасы падчас стрыжкі, а плаўна здымала пасму за пасмай. Яе салдат прынёс з вайны ў сваім паходным заплечным рэчавым мяшку. Яна была ў ліку трафеяў, якія ўмясціліся ў яго «сідары» разам з парай сподняй бялізны ды зменных ануч з ручніком і кавалкам мыла.

Стрыг усіх сам гаспадар, яго самога — жонка. Потым машынку даверылі старэйшаму сыну, за ім — сярэдняму. А калі яны адзін за адным былі прызваны на абавязковую службу ў войска і ўжо не вярнуліся да бацькоўскай хаты — засталіся ў гарадах вучыцца і працаваць, чарга наступіла браць інструмент у рукі малодшаму з сыноў — Шурку. А той упёрся і — ні ў якую, заявіўшы прылюдна: «Яшчэ чаго, я да гэтай фашысцкай заразы і дакранацца нават не буду!» Падлетак ужо праходзіў у школе гісторыю і да Германіі, з яе гітлераўцамі-фашыстамі, якія напалі на нашу краіну, у яго было поўнае непрыманне, як не сказаць нянавісць.

У той дзень на такі рэзкі выпад хлопчыка Мікалай Смоляк, які сядзеў у чарзе, слушна заўважыў:

— Ну, ты, браточак, не маеш рацыі — такія добрыя штукі не мог рабіць фашыст. Не інакш яе рабіў сапраўдны майстар. У Германіі ж былі не толькі фашысты, але і антыфашысты і проста звычайныя рабочыя людзі. Ні за што я не паверу, што той, хто сваім мазалём зарабляў на хлеб, мог быць нягоднікам.

Аднаногага Мікалая Смоляка паважалі не толькі на вуліцы, але і ва ўсім пасёлку. Аднапасельцы ведалі, што ён, пакуль ваяваў, страціў сям'ю: жонку і дваіх дзяцей фашысты спалілі разам з іншымі жыхарамі суседняй вёскі, зачыніўшы людзей у былой калгаснай стайні. Пасля вайны, будучы інтэрнатаўцам і не маючы родных, ён трапіў у мясцовы інтэрнат для інвалідаў. Там такіх, як ён, — бязногіх, бязрукіх гаротнікаў, — было сабрана некалькі вялікіх драўляных карпусоў. Застаўшыся ўдовамі, мясцовыя жанчыны і нават дзяўчаты паразбіралі ўсіх мужчын і хлопцаў-інвалідаў, якія маглі хоць неяк рухацца, і павыходзілі за іх замуж.



Аднаногія, тыя, што маладзейшыя, уладкоўваліся на работу. У адным толькі пасялковым клубе іх працавала трое: кінамеханік, загадчык бібліятэкі і самога клуба. Кінамеханік перасоўваўся з дапамогай мыліц, а «начальства» — на пратэзах. На гэтай жа вуліцы, акрамя Мікалая Смоляка, у якога нагі не было па самы пах, жыло яшчэ двое інвалідаў — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Адзін з іх, Рыгор Аверын, быў без рук, замест іх — дзве куксы па самыя локці. Яшчэ адзін жыхар вуліцы быў без ног і перасоўваўся на цялежцы-каталцы. Да іх усе прывыклі, ім дапамагалі, хто як і чым мог: тым жа бясплатным пастрыжэннем, узаранем агарода, падвозам дроў.

Падціснуўшы вусны і насупіўшы для парадку бровы, хлопчык з таго дня вымушаны быў узяць у рукі інструмент. Бацька даверыў яму тых, хто стрыгся нагала, — такіх жа, як сам «майстар», падшыванцаў. Тут ад «цырульніка» асобай прамудрасці не патрэбна было — зачапіў паласу ад ілба і пайшоў шчоўкаць — чыкчырык — да затылка, потым зноў баразну прапахаў. Але кожны раз, прыступаючы да пастрыгання малечы, нягледзячы на довады аднаногага суседа, Шурка надзьмуваўся і аб чымсьці ўпарта думаў.

«Гэта ж машынка не вінаватая, што яе рабіў немец. Яна ж не вінаватая, што з вайны не вярнуўся дзядзька Міша-мінамётчык і дзед Прахор, якіх я нават у вочы не бачыў жывымі, ды і яны мяне таксама. Дзядзька такі яшчэ малады быў і нават не жанаты, а склаў сваю галаву ў той чортавай Германіі. Ды яшчэ і ў самым канцы вайны! Прыкра! Ён такі прыгожы на партрэце ў зале вісіць. З баявымі ордэнамі і медалямі! А дзед? Калі маці спыняецца і глядзіць на яго фотаздымак, які вісіць у сямейнай рамцы пад шклом, дык адразу відно, што яна ўся ў яго ўдалася, — такі ж прамы нос ды бровы шнурочкам. Толькі што без вусоў. У дзеда яны ёсць. Пра яго наогул ніхто нічога не ведае — прапаў, як у ваду кануў, на самым пачатку той праклятай вайны. Вунь бацька ўсё запытанні шле кудысьці», — думаў-апраўдваў сябе хлопчык, з люцю выстрыгаючы-выскубаючы «фашысцкай» машынкай крывыя белыя барозны на маленькіх галовах сваіх суседзяў. Тыя цярпелі яго выкрутасы і толькі ціха саплі.

«А ў чым вінаваты гэты дзядзька Смоляк, што ён з адной нагой застаўся і без дзяцей? Дык няхай хоць бы гэтая д'ябальская машынка паслужыць яму! Тым больш што ён кажа, што яна добрая штука і што яе майстравалі не фашысты. Зразумела, куды ім — тым фашыстам! Ім бы толькі аўтамат у руках трымаць ды страляць-забіваць і калекамі рабіць людзей».

Кожны раз, беручы ў рукі «добрую штуку», Шурык пераконваў сябе, што знаходзячыся тут, далёка ад таго месца, дзе была зроблена, гэтая машынка бездакорна служыць-вымольвае дараванне за тых салдат-забойцаў, па віне якіх не вярнуліся дамоў яго блізкія родзічы і суседзі, а тыя, што вярнуліся, былі калекамі.

У адказ машынка — «добрая штука» маўчала. А што яна магла сказаць беларускаму хлопчыку, які хоць і нарадзіўся ўжо пасля вайны, але ў сям'і, якую напрамую кранула гэтая страшэнная бяда і ў якой багата што напамінала аб ёй і не давала забыць...

**Раіса ДЗЕЙКУН**

■

■ Падарожнік

# ІДЭАЛЬНАЯ ВАНДРОЎКА

**З усіх бакоў ідэальная. Калі існуе ў свеце нешта, што ўвасабляе сумяшчэнне жадання і рэальнасці, дык гэтае нешта (прынамсі, у сённяшнім маім разуменні) знаходзіцца ў Берастаўіцкім раёне, у вёсцы Лішкі, каля тонкай, як слёзная вена, Свіслачы.**

Там стаіць абсалютна свабодны двухпавярховы каменны палацык. Збудаваны ён на манер італьянскай вілы, з трохяруснай вежай, якая мае па два акенцы на кожным з чатырох сваіх бакоў — высокія, вузкія, з паўкруглым верхам. Палацык гэты адным сваім бокам прыточаны да маляўнічага драўлянага аднапавярховіка, відавочна больш старога, але больш-менш годнага, з ганкам, абапал якога стаяць калоны, звернутым, што важна, на сваёй поўдзень. Убачыўшы такое хараство адзін толькі раз (і тое на здымку), я не магу адмовіць сабе ў жаданні ўбачыць яго ў рэальнасці. Вось і сумяшчаю — жаданне з рэальнасцю.

Даўно, ведаеце, хацелася паехаць туды-невядома-куды, каб толькі выконваліся дзве ўмовы. Першая з іх — магчымасць спыніцца каля вадаёма — каб, па-першае, мець на сняданак свежазлоўленага ляшча ці хоць бы акунькоў, па-другое, чуць хор жабак, пад які — уже праверана — сняцца найлепшыя летнія сны. Другая ўмова — наяўнасць паблізу «стаянкі» нічыйнага сядзібнага дома, з цэлымі дахам і сценамі, не сапсаванымі ніядаўнім мінулым, і з гісторыяй, не абцяжаранай ніякімі прывідамі, — каб найлепшыя летнія сны не спалохаць. Марылася, ведаеце, з аднаго боку, пажыць на ўлонні прыроды, удасканаленай толькі намётам, а з другога — адчуць сябе гаспадарамі сядзібы, няхай сабе толькі на некалькі дзён.

Асобы рэальных, некалішніх гаспадароў мелі пры гэтым значэнне, і немалое. Бо адна справа бавіць свой каштоўны вольны час у сценах, якімі валодалі тыповыя паны Пампалінскія, і зусім іншая — калі сцены гэтыя гістарычна належаць тым, хто, ігнаруючы ўласныя выгоды, накіроўваў погляды да «зор вялікіх ідэй». Ну і вось. Такая сядзіба знайшлася.

Бываюць жа выпадкі, калі напаўстрачанай гістарычнай спадчыне радуешся больш, чым гэтай стратай абураешся. Бывае наваг так, што жаданне перавыконваецца — рэальнасць яго перасягае. Трэба ж было такому здарыцца, каб пошук нічыйнай сядзібы выпадкова, праз сімпатыю да фотаздымка, прывёў да колішняга ўладання дэ Вірыёнаў — сямейства з больш чым вартай гісторыяй кожнай сваёй асобы. Што найбольш прывабна — сярод гэтых асоб сустракаюцца калегі па адукацыі і захапленні. Асаблівае замілаванне ў аднаго з іх, прыродазнаўца Станіслава дэ Вірыёна, выклікалі, бадай, найбольш брутальныя істоты жывога надземнага свету — насякомыя атрада цвердакрылых, папросту — жукі. Ён меў іх вялікую колькасць — і з нашай фаўны, і замежных — у выглядзе ўпарадкаванай калекцыі. З мэтай сістэматызацыі экспанатаў і паглыблення ведаў пра іх пан Станіслаў вёў перапіску з прафесарамі розных нямецкіх універсітэтаў. Лісты ад іх прыходзілі сюды, у Лішкі, значыць, гэтая геаграфічная назва магла выводзіцца і рукой якога-небудзь Вейсмана або Лейдзіга — мужоў, якія, як прынята казаць, пакінулі ў навуцы значны след. Хто ведае, ён мог напісаць нават самому Дарвіну або, скажам, Гекелю, бо тыя былі яго сучаснікамі. Станіслаў дэ Вірыён жыў да 1909 года, значыць, мог быць знаёмы і з нашымі слаўнымі землякамі-натуралістамі братамі Дыбоўскімі — Бенедыктам, які адкрыў самага вялікага жука беларускай фаўны, рагача, ці жука-аленя Lucanus maculifemoratus, або Уладзіславам, магіла якога знаходзіцца ў Навагрудскім раёне.

Менавіта энтамолаг Станіслаў дэ Вірыён і пабудаваў гэты дом на манер італьянскай вілы. Два ранейшыя, будаваныя папярэднімі ўладальнікамі, згарэлі — кожны па сваёй прычыне, і мы не ведаем, якія яны выглядалі. А Станіслаў архітэктар быў, трэба думаць, з вялікім густам і выдумкай. Не спланаваў нешта новае, а «сплясаў», як ад печкі, ад старой афіцыны. І гэтая драўляная частка так удала спалучылася з новай, каменнай, што... Для ідэальнага падарожжа «стаянка» атрымалася самая што ні ёсць прывабная. Значыцца, мы збіраемся. Я ўжо мару, як увайду ў гэты дом.

Парадным уваходам у яго трэба лічыць ганак драўлянай часткі (так і было), за ім павінны ісці доўгія вузкія сенцы, якія, як пісаў Афтаназы (якога трэба чытаць і перачытваць кожнаму сапраўднаму вандроўніку па Беларусі), упоперак перасякаюць будынак аж да паўночнай сцяны і маюць паабапал сябе на адзін бок два вялікія пакоі, на другі бок — яшчэ два, з якіх адзін — сталовая, другі — канцылярыя. Нават калі ўсё ўжо не так, то ўяўленне — вялікая сіла!

Мне цікава, дзе размяшчалася калекцыя цвердакрылых. Спытаць няма ў каго, але можна ўявіць, што менавіта тут, у канцылярыі. Калекцыя знікла падчас Першай сусветнай, хоць пасля смерці гаспадара нашчадкам яго, пляменнікам Адамам (Станіслаў дэ Вірыён быў бяздзетным), яшчэ зберагалася.

У маіх планах — прывезці з ваколіц сядзібнага дома дэ Вірыёнаў трошкі нашчадкаў тых цвердакрылых, якія былі тут злоўлены паўтара стагоддзя таму. Ці не для гэтай мэты здабыла некалі сачок на бамбукавай ножцы? Застанецца толькі ўспомніць, як «касіла» насякомых у студэнцкія гады ў ваколіцах Шчомыслiцы — каб назбіраць абавязковыя паўсотні экзэмпляраў для заліку па заалогіі беспазваночных. Настальгія!

У каменнай частцы дома размяшчаліся салон, спальня, зімовы сад... Сцены былі гладкія, фарбаваныя ў белы колер. Мой любімы! І белы ж колер мелі печы, абкладзеныя кафляй. Кажуць, печы яшчэ стаяць. Кажуць таксама, што мясцовыя жыхаркі за домам прыглядваюць. Значыць, чакаюць нас!

А вежа, якая ўзносіцца над паўночна-заходняй часткай дома? Яна мае вінтавую лесвіцу. Рамантыка!

Галоўная прыкмета ідэальнага падарожжа — тое, што яно яшчэ будзе. Як усё складзецца — хто ведае... Рэчка, прынамсі, не вельмі блізка і не зусім для рыбнай лоўлі. Але мы збіраемся: шэры навігатар Арчы і вясёлая сямейка ў шэрым «шатле», загружаным, як заўсёды, пад самы дах. Палатка, лодка, рыдлёўка, турыстычная плітка... Стол, зэдлікі, кацялок, халадзільнік, талеркі... Хоць, як пішуць гістарычныя даведнікі, у маёнтку дэ Вірыёнаў налічвалася некалі тры шынкі і чатыры карчмы.

Пажадай нам, чытач, удалага падарожжа. А калі вырашыш рушыць услед — там сустрэнемся!

**Святлана ВОЦІНАВА**



Караль Юзаф дэ Вірыён — першы дэ Вірыён на беларускай зямлі.

## *Рамантыкам*

Дзед Станіслава дэ Вірыёна, дом якога ў Лішках мы вырашылі наведаць, меў імя Караль Юзаф. Нарадзіўся ў Францыі, у Нансі, і прыехаў на нашу зямлю, каб застацца тут урачом — спачатку лекарам нясвіжскіх Радзівілаў, пасля доктарам Гродзенскай каралеўскай эканоміі і выкладчыкам хірургіі і анатоміі ў тамтэйшай медакадэміі, заснаванай па загадзе Тызенгаўза Жанам Эмануэлем Жылiберам, з якім, як з земляком-французам, запрыязніўся. Пасля падзелу Рэчы Паспалітай Караль Юзаф захацеў застацца на нашай зямлі. А ў 1812-м рушыў на Маскву з польскім пяхотным корпусам арміі Напалеона ў якасці галавы ваеннага шпіталя. Напалеон уласнаручна ўручаў яму за гэта ордэн Ганаровага Легіёна. А пасля доктара дэ Вірыёна расійскія ўлады павінны былі рэпрэсіраваць, але памілавалі. Памёр ён праз пяць гадоў пасля таго, і не ў Лішках, а на Случчыне, дзе таксама меў нейкае жытло. Пахавалі яго ў Нясвіжы, куды ён першапачаткова са сваёй Францыі і прыехаў, — на манастырскіх могілках. І, кажуць, у гонар аб напалеонаўскай старонцы яго жыцця існаваў пасля ў доме ў Лішках «пакой Напалеона». Так было тады модна — кумірам прысвячаць пакоі ў доме.

Пра тое, што Караль Юзаф дэ Вірыён быў масонам, захавальнікам пячаткі ложы «Шчаслівае вызваленне», можна і не пісаць: хто з нашых, беларускіх французаў таго часу, ды яшчэ сяброў Жылібера, не быў масонам?




Яшчэ ў 1930-я салон дома Вірыёнаў у Лішках выглядаў так.



Архітэктар быў, трэба думаць, з выдумкай: новы дом «датачыў» да старой афіцыны. А ў вежы размешчана вінтавая лесвіца.

■

■ Калі мама — парламентарый

# «Ларанс галасуе разам са мной»

**У залу пасяджэнняў Крысціна Мур, член парламента Канады, заходзіць з перанаснoй дзіцячай калыскай. Побач — мужчыны ў пінжаках, жанчыны на абцасах, з калонак чуюцца гучныя прамовы палітыкаў свету аб тэрарызме, эканоміцы, правах чалавека... А двухмесячная Ларанс, чыя маці прыехала на Парламенцкую асамблею Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, якая адбывалася ў Мінску на мінулым тыдні, мірна спіць. Спіць і жмурыцца ад яркіх успышак беларускіх фатографаў!**

— Я нарадзіла сваю першую дачку падчас выбараў у 2015 годзе, — расказвае Крысціна Мур. — Яна была са мной у парламенце да трох месяцаў. А два месяцы таму я нарадзіла другое дзіця. Кармлю яе сама, таму пакуль не магу пакінуць дома. Наш спікер парламента дазваляе прыносіць жанчынам-парламентарыям сваіх дзяцей да года на працу. Дафні, мая першая дачка, была са мной у канадскім парламенце, а цяпер ужо Ларанс галасуе разам са мной, вандруе. Яна, у прынцыпе, ужо частка парламента. У яе ўнікальная прывілея.

Крысціна Мур — член Палаты абшчын Канады (ніжняй палаты парламента, але вядучай), а па прафесіі — медсястра. Яе абралі ў 2011 годзе. Увогуле ў Канадзе жанчына мае права быць год у дэкрэтным адпачынку, але ў парламентарыяў такой магчымасці няма. «Падчас другой цяжарнасці я брала тры тыдні бальнічнага, бо мой доктар забараніў вялікія нагрузкі пасля другіх родаў, сказаў, што трэба аднавіцца і нельга вандраваць больш, чым некалькі кіламетраў у тыдзень, — прызнаецца Крысціна Мур. — З 15 мая я ізноў прыступіла да работы».



Фота Надзеі БУЖАН.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

*pustavit@zviazda.by*

■

# КАХАННЕ І АРЫГАМІ



## «Матэрыяльныя рэчы ніколі не павінны стаяць на першым месцы»

— Вы думаеце, гэта звычайныя паперкі? А вось і не *(усміхаецца)*. Дзякуючы ім у майго сябра Івана Барбука сям'я стварылася.

Пяць гадоў таму Дзмітрый Лысюк задумаў зрабіць невялічкую выстаўку ў музеі Вялікай Айчыннай вайны. Але зусім нечакана яму выдзелілі вялізную залу.

— Аднаму такую маштабную выстаўку было зрабіць складана. Таму я напісаў лісты ўсім сваім сябрам-арыгамістам у Расію, Турцыю, Украіну... Кожны з іх даслаў па пасылцы: хто 10, хто 20 работ. У выніку атрымалася шыкоўная экспазіцыя. Усяго было каля 400 папяровых скульптур.

Дапамагчы з афармленнем залы я папрасіў свайго сябра Івана, які папяровай пластыкай займаецца з дзяцінства. Там ён і пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай. Насця працавала ў аддзеле, які займаўся арганізацыяй нашай выстаўкі.

**«Нічога добрага з прымусу, як правіла, не атрымліваецца. Трэба заўсёды даваць выбар, паказваць вялікую колькасць магчымасцяў».**

У той час да мяне ў госці завітаў таварыш з Кемераўскай вобласці. Прыйшлі мы разам з ім на адкрыццё. Жэня і кажа: «Ваня, ты жанаты? Глядзі, па-мойму гэтая курчавая дзяўчына да цябе неабыякавая. Не тармазі». І недзе праз год пасля той выстаўкі мы ўжо гулялі на іх вяселлі. Цяпер Ваня і Насця выхоўваюць цудоўнага сына. А мяне жартам называюць вясельным генералам ды хросным бацькам сваёй сям'і.

...Вось так жывеш сабе, займаешся арыгамі. А калі такія выпадкі здараюцца, адразу ў цуды пачынаеш верыць. На першы погляд, звычайныя паперкі, але яны такую добрую справу зрабілі.

***— Дзмітрый, што вы лічыце большым дасягненнем: перамогу ў чэмпіянатах па арыгамі альбо тое, што дзякуючы вам Ваня стварыў сям'ю?***

— Вядома, тое, што Ваня стварыў сям'ю. Дасягненні ды матэрыяльныя рэчы ніколі не павінны стаяць на першым месцы. Галоўнае — людзі, адносіны. Дарэчы, мы з Іванам у гэтым падобныя. Ён на наступны год пасля таго, як ажаніўся, рыхтаваўся да ўдзелу ў чэмпіянаце па арыгамі. Усё склаў прыгожанька. Заставалася толькі сфатаграфаваць работы і даслаць. Але за паўгадзіны да фіналу ён пасварыўся з Насцяй. Я ў той год быў у ліку суддзяў. І вельмі здзівіўся, калі не ўбачыў фотаздымкаў Барбука. Назаўтра пытаюся: «Чаму не даслаў?» Аказалася, што ён проста не паспеў дафатаграфаваць, бо для яго было важней памірыцца з жонкай. «Малайчына, — кажу, — правільна зрабіў. Наступны раз пагуляеш». Дарэчы, чарговая, сёмая, алімпіяда будзе ў лістападзе. Яна праходзіць у інтэрнэце. Прыняць удзел у ёй можа кожны.

## «Важна, каб у мужчыны быў занятак па душы»

Цяпер Дзмітрый з Іванам не толькі ладзяць сумесныя выстаўкі ды майстар-класы, але і сябруюць сем'ямі.

— Лічу, мне і Ваню вельмі пашанцавала, бо нашы жонкі паважаюць і падтрымліваюць наша захапленне. Важна, каб у мужчыны быў занятак па душы, які акрыляе. У адваротным выпадку, ведаю шмат такіх гісторый, ён пачынае зазіраць у бутэльку.

Што датычыцца выхавання дзяцей, то я не разумею бацькоў, якія штосьці навязваюць сваім сыночкам-дочкам ледзь не з пялюшак. Напрыклад, мы — музыкі, значыць, малы павінен іграць на скрыпцы. А можа, ён геніяльны повар, а скрыпку проста з радасцю паслухае?.. Нічога добрага з прымусу, як правіла, не атрымліваецца. Трэба заўсёды даваць выбар, паказваць вялікую колькасць магчымасцяў. А калі абмяжоўваць ды самарэалізоўвацца за кошт дзіцяці, дык потым будзе чалавек мучыцца ўсё жыццё.

Кожны з нас нараджаецца са сваім унікальным прызначэннем, місіяй. Калі вы яшчэ не знайшлі справу свайго жыцця, ад якой вырастаюць крылы, шукайце. І няважна, колькі вам гадоў. Мне, напрыклад, было амаль сорак, калі я адкрыў для сябе свет арыгамі. Лепш знайсці позна, чым не знайсці наогул.

Бліжэй да сарака гадоў у большасці мужчын пачынаецца крызіс сярэдняга ўзросту, калі адбываецца пераацэнка зробленага.

— У мяне ў той час яшчэ былі праблемы са здароўем, ляжаў у бальніцы. Трэба было нечым сябе заняць. Хтосьці красворды разгадвае, хтосьці газеты чытае... Мяне гэта ўсё не захапляла. І вось зусім выпадкова ў рукі трапіў кавалак паперы. І мне прыйшла думка скласці арыгамі. Паспрабаваў. Спадабалася. Адразу ж адчуў, што гэта маё.

Сёння без арыгамі Дзмітрый не ўяўляе свайго жыцця. Яму падабаецца рабіць складаныя рэчы.

— Калі толькі вучыўся, карыстаўся гатовымі схемамі. Апошнім жа часам вельмі хочацца самому штосьці прыдумваць, мадэляваць. У мяне ёсць каля 15 аўтарскіх работ. Сярод іх і галактыка. Менавіта яна мне прынесла першае месца на чэмпіянаце ў 2015 годзе. Я не шукаю лёгкіх шляхоў, выкарыстоўваю незвычайную паперу альбо сам таніру звычайную акрылавымі фарбамі. Гэта вельмі цікавы і творчы працэс.



Фота Надзеі БУЖАН.

Падчас інтэрв'ю Дзмітрый ЛЫСЮК склаў для нас з фатографам па зорачцы і павіншаваў са 100-гадовым юбілеем газеты.

**«Нядаўна выклікаў сваім падарункам шчырую ўсмешку ў заклапочанай чымсьці жанчыны, якая ехала з працы. Мне падалося, што яна на секундачку пачала жыць «тут і цяпер», забылася пра свае праблемы».**

## «Дырэктар падтрымлівае маё хобі»

Дзмітрый скончыў фізічны факультэт БДУ. Цяпер працуе інжынерам-даследчыкам. Займаецца наладкай спектральнага абсталявання ў адной са сталічных арганізацый.

— Мне вельмі пашанцавала з кіраўніцтвам, дырэктар падтрымлівае маё хобі. Нядаўна наша фірма была на выстаўцы ў Маскве, дык я ўпрыгожыў стэнд сваімі арыгамі і зрабіў 3D-візітоўкі з багіняй перамогі Нікай у падарунак для партнёраў. Гэта вельмі выгадна вылучыла нашу фірму сярод астатніх. І, як паказвае практыка, творчая атмасфера толькі спрыяе наладжванню дзелавых кантактаў.

Да 8 сакавіка каляжанкам зрабіў па матыльку. Іх было 25, і ўсе непадобныя адзін на аднаго, як і самі жанчыны. Вось радасці было! Мне падабаецца дарыць прыемныя эмоцыі людзям. Часта, пакуль еду ў аўтобусе, складаю якую-небудзь фігурку. А пасля дару. І дзецям, і дарослым. Нядаўна выклікаў сваім падарункам шчырую ўсмешку ў заклапочанай чымсьці жанчыны, якая ехала з працы. Мне падалося, што яна на секундачку пачала жыць «тут і цяпер», забылася пра свае праблемы.

Адна з работ арыгаміста знаходзіцца ў Лі «Скрэч» Пэры, ямайскага музыкі, аднаго з заснавальнікаў стылю рэгі.

— Адмыслова для яго я зрабіў цмока Руй-зіна, вельмі складаная і прыгожая мадэль. Складваў яе каля 4 месяцаў. І калі мой кумір прыехаў у Мінск з канцэртам, я яму яе падарыў. Так споўнілася мая даўняя мара асабіста пазнаёміцца з музыкам.



На сваё вяселле Іван БАРБУК склаў папяровых жаніха і нявесту.

**Сёлета на папяровыя скульптуры Дзмітрыя ЛЫСЮКА і Івана БАРБУКА можна было падзівіцца ў Наваполацку, Крычаве ды ў Гомелі. У Мінску ж выстаўка адбудзецца з 14 па 28 жніўня ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры», якая знаходзіцца ў Палацы Рэспублікі. Прыходзьце. Уваход бясплатны.**

Яшчэ адна мара Дзмітрыя неўзабаве, спадзяюся, таксама споўніцца. Ён хоча адкрыць уласную студыю, дзе зможа перадаваць свае майстэрства іншым.

— Арыгамі — цудоўны спосаб баўлення часу як для дзяцей, так і для дарослых. Сёння і адны і другія не вылазяць з тэлефона. Гэта вельмі небяспечна. Я, напрыклад, у дзяцінстве любіў клеіць пластмасавыя самалёцікі, складваў мазаікі, канструктары, ды шмат чаго. Цяпер жа хлопчыкам і дзяўчаткам змалку навязваецца ўсё гатовае. Ім нічога самім не трэба рабіць. І гэта вельмі сумна... Чым менш дзеці будуць развіваць дробную маторыку, тым у іх менш будзе развітая фантазія, кемлівасць, логіка і мэтанакіраванасць.

***— Дзмітрый, за 8 гадоў вы зрабілі вельмі шмат незвычайных папяровых скульптур. А не думалі знайсці ім практычнае прымяненне?***

— Думаю. Вось гэтую мазаіку з паперы я, напрыклад, аформіў як лавец сноў. І цяпер яго можна падвесіць над ложкам дзіцяці. А вось гэты чырвоны самалёцік ужо паспеў знясца ў рэкламе сотавага аператара. Мае папяровыя батоны выкарыстоўваліся ў афармленні музычнага альбома. Ёсць яшчэ задумкі працаваць у дызайне інтэр'ера. Вось гэтае белае сэрца, напрыклад, служыць у мяне дома абажурам. Яно зроблена з будаўнічай паперы — даўгавечнага матэрыялу. Каб надаць трываласць сваім вырабам, дадаткова прапітваю іх экалагічнымі лакамі. Была думка заняцца і ювелірнымі ўпрыгажэннямі. Кулон зрабіў, бранзалет на руку. Іх вельмі цяжка складаць. Але пакуль людзі не гатовыя аддаваць вялікія грошы за папяровую біжутэрыю *(усміхаецца)*.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
*nadzieja@zviazda.by*

**Больш фота глядзіце на сайце www.zviazda.by**



Арыгамі Дзмітрыя ўражваюць і заваражваюць.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

| | |
|---|---|
| Организация | **ООО «Глобал Иншуранс Брокер Ко»** |
| 10. | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной цены земельного участка, р/с BY49AKBB36410616005746200000 в ЦБУ №616 в филиале 612 ОАО АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25«А», БИК AKBBBY21612, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион») |
| 11. | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками | каждую среду в 15.00 |
| 12. | Окончательный срок приема заявлений | **7 августа 2017 года до 17.00** |
| 13. | Контактный телефон | 8-01775 35-449, 8-01775 37-174, 8-01775 37-189 |

**Расходы по организации и проведению аукциона и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона и составляют: земельный участок в дер. Калюжки – 1 687,32 рублей, и земельный участок в аг. Барсуки – 1 519,27 рублей, земельный участок в дер. Замлынье – 1 657,92 рублей, земельный участок в дер. Яловица -1 725,23 рублей, земельный участок в дер. Калюга – 1 652,57 рублей и земельный участок в дер. Белая Лужа – 1 444,83 рублей (без учета стоимости информационного сообщения).**

Примечания: для участия в аукционе на адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица.
4. Доверенность, заверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества** | **Лот № 1:** Пускозарядное устройство ENERGY 1000 START, начальная цена 722 рубля;<br>**Лот № 2:** Погрузчик DIECI AGRI FARMER 30.7, 2012 г.в., начальная цена 40 700 рублей;<br>**Лот № 3:** Станок оцилиндровочный МАСТЕР ОС-550, 2014 г.в., начальная цена 4558 рублей;<br>**Лот № 4:** Мягкая мебель КОНСУЛ (диван, 2 кресла), начальная цена 1360 рублей;<br>**Лот № 5:** Набор офисной мебели (комод, стол, 2 шкафа, зеркало, полка), начальная цена 369 рублей |
| **Собственник (владелец) имущества** | СООО «Бивер Трейд» УНП 391002832 |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Витебская обл., г. п. Шумилино, ул. Северная, 9 |
| **Информация об обременениях** | не имеет |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | 27.07.2017 в 11.00, г. п. Шумилино, ул. Вокзальная, 3 |
| **Справочная информация** | Отдел принудительного исполнения Шумилинского района, 211259, г. п. Шумилино, ул. Вокзальная, 3, otdprinisp.shum@tut.by<br>Судебный исполнитель Скоринова Светлана Александровна, тел. (02130) 4 15 46 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть зачислен в срок до 26.07.2017 на счет: отдела принудительного исполнения Шумилинского района: филиал 200 ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 225 г.п. Шумилино, код банка AKBBBY21200, р\с № BY79AKBB36429030050332000000, УНН 300002505.<br>Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).<br>В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем). |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж», г. Минск, ул. Харьковская, 15. Тел.: +375 17 256 90 05 |

**Предмет аукциона**
**Недвижимое имущество, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, д. 9А**

| № п/п лота | Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Здание холодного склада (литер Б 1/м)** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 303 кв. м | 500/С-31540 |
| **Составные части и принадлежности** | площадка цеметно-бетонная (207 кв. м), площадка из плит дорожного покрытия (207 кв. м), ограждение из панелей железобетонных (высота 2,3 м*, длина 32,5 м) | | | |
| **Оборудование** | кран-балка электрическая, г/п 5 т, инв. № 41, дата ввода в эксплуатацию – 1991 г. | | | |
| **Обремения** | Договор аренды. Подробная информация на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY | | | |
| Начальная цена с НДС 20 % – **63 240,00 белорусских рублей**<br>Шаг аукциона – **3 162,00 белорусских рублей** | | | | |
| 2 | **Здание склада с гаражом (литер А 2/кп)** | Здание многофункциональное | 476 кв. м | 500/С-31450 |
| **Составные части и принадлежности** | площадка цементно-бетонная (631 кв. м) | | | |
| **Оборудование** | неисправная кран-балка электрическая, г/п 2 т, инв. №40 | | | |
| **Обремения** | Договор аренды. Подробная информация на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY | | | |
| Начальная цена с НДС 20% – **200 400,00 белорусских рублей**<br>Шаг аукциона – **10 020,00 белорусских рублей** | | | | |
| 3 | **Здание столярной мастерской (литер В 1/м)** | Здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель | 68 кв. м | 500/С-32065 |
| **Составные части и принадлежности:** | площадка цементно-бетонная (53 кв. м), площадка из плит дорожного покрытия (26 кв. м), площадка под некапитальное строение | | | |
| **Обремения:** | Договор аренды. Подробная информация на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY | | | |
| Начальная цена с НДС 20 % – **17 520,00 белорусских рублей**<br>Шаг аукциона: **876,00 белорусских рублей** | | | | |

**Сведения о земельном участке: лоты 1–3 расположены** на неделимом земельном участке площадью 0,2892 га, предоставленном на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений производственной базы.
Ограничения прав: обеспечение доступа для производства ремонтно-восстановительных работ, пл. 0,2892 га

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления:** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Боков Игорь Петрович, начальник участка малой механизации, контактный телефон +375-33-604-69-58 |

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** www.cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с №BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона.

**Срок оплаты:** не более 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. №16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %.

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **16.08.2017** в 10.30 по адресу**: г. Минск, ул. Харьковская, 15, 3-й этаж, ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж».** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **14.08.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.<br>Email: auction@cpo.by |

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению открытого акционерного общества «Планар», проводит открытый аукцион по продаже **здания цеха деревообработки**, общей площадью **1 307,1 кв. м**, инв. № 601/С-27937, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 623288005101000004 (предоставлен на праве постоянного пользования) площадью 0,3209 га, по адресу: Минская область, Логойский район, Янушковичский с/с, д. Жабичи, ул. Метростроевская, 20Г.

Здание цеха деревообработки сдается в аренду *(сведения можно получить у организатора аукциона или продавца)*.

Начальная цена с НДС (20%) – **422 302,08** бел. руб. Задаток 10% от начальной цены (**42 230,00** бел. руб.), перечисляется на **р/с № BY55BPSB3012 1082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК в формате IBAN BPSBBY2X, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **21.08.2017** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.08.2017** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

## РУП «Жилкоммунтехника» (организатор аукциона) г. Минск ул. Кальварийская, 25, каб. 209

**Извещает о проведении повторного аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества, принадлежащего РУП «Жилкоммунтехника» на праве хозяйственного ведения. Местонахождение имущества: г. Минск, ул. Чапаева, 4**

| № лота | Наименование объекта, сведения об объекте | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел.руб. | Размер арендной платы в месяц |
|---|---|---|---|---|
| Капитальное строение с инв. №500/С-23649 «Здание специализированное автомобильного транспорта» – Гараж (Литер Г 1/м), не отапливаемое. Коэффициент спроса – 1,25; базовая ставка – 0,5; коэффициент месторасположения – 1,0 | | | | |
| 1 | Гараж 109,9 м кв. | 261,01 | 26,10 | 1 044,05 |
| Капитальное строение с инв. №500/С-23648 «Здание специализированное автомобильного транспорта» – Гараж (Литер Д 1/м), не отапливаемое. Коэффициент спроса – 1,25; базовая ставка – 0,5; коэффициент месторасположения – 1,0 | | | | |
| 2 | Гараж 46,0 м кв. | 109,25 | 10,93 | 437,00 |
| Капитальное строение с инв. №500/С-36553 «Здание специализированное автомобильного транспорта» – Гараж (Литер Ж 1/к), не отапливаемое. Коэффициент спроса – 1,25; базовая ставка – 0,5; коэффициент месторасположения – 1,0 | | | | |
| 3 | Гараж 21,1 м кв. | 50,11 | 5,01 | 200,45 |

| | |
|---|---|
| Срок подачи заявления | **По 26 июля 2017 г**. **до 12.00** в рабочие дни с 10.00 до 17.30<br>по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, 25, каб. 209 |
| Дата, время, место, проведения аукциона | **27 июля 2017 г. в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Кальварийская, 25, каб. 209.<br>Дата и время заключительной регистрации: 27.07.2017 в 11.40 |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с BY93BLBB30120100135569001001 в ЦБУ №538 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, код BLBBBY2X , УНП 100135569, получатель – РУП «Жилкоммунтехника» |
| Условие продажи и пользования | Размещение офисов, организация производства (кроме вредного), оказание услуг, торговля (любая), размещение складских помещений |
| Условия продажи | Срок договора аренды – 1 год, шаг аукциона 5%. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение |

**Условия участия в аукционе:**

Для участия в аукционе необходимо:
1. До окончания приема заявок платить задаток на расчетный счет Организатора аукциона, заключить с организатором соглашение.
2. Подать заявление Организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов.
К заявлению прилагаются следующие документы:
- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);
- индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; - юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица;
При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.
Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.
Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор аренды в срок не позднее 10 рабочих дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое право аренды в срок, определенный в договоре аренды, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору аренды.
Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь.
Контактное лицо для осмотра помещений: Сайко Андрей Геннадьевич, тел. моб. (044) 552 42 92

**Дополнительная информация по тел.: 8 (017) 204 71 51, 204 78 81 (тел./факс)**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению ОАО «Несвижское ПМК–23» (продавец), проводит открытый аукцион по продаже одним лотом имущества в составе: **котельная,** инв. № 621/С-13795 **пл. 46,9 кв. м; пункт технического обслуживания,** инв. № 621/С-13797 **пл. 515,7 кв. м; сарай на 18 с/х машин,** инв. № 621/С-13793 **пл. 332,7 кв. м; диспетчерская,** инв. №621/С-13792 **пл. 64,7 кв. м; гараж на 5 машин,** инв. № 621/С-13794 **пл. 244,2 кв. м; здание административное,** инв. № 621/С-13796 **пл. 337,3 кв. м; склад** инв. № 621/С-13791 **пл. 208,3 кв. м; здание нефтесклада** инв. № 621/С-1026798 **пл. 30,2 кв. м (в состав входят ограждение базы и площадка под стоянку автомашин); низковольтная кабельная сеть** (инв. № по бух. учету 0317)**; наружные сети водоснабжения** (инв. № по бух. учету 0323)**; наружные сети теплоснабжения инв.** (инв. № по бух. учету № 0324)**; сети канализации** (инв. № по бух. учету 0375). Указанные объекты расположены на земельном участке площадью **1,9512 га** с кадастровым номером 624250100001000849 (право постоянного пользования) по адресу: Минская область **г. Несвиж, ул. Ленинская, 122а**.

**Начальная цена с НДС (20%) – 552 136,80 бел. руб.**

**Задаток 10% от начальной цены (55 213,68 бел. руб.) перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК в формате IBAN BPSBBY2X, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объекты производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **16.08.2017** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.08.2017** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

# «РАМАНТЫКА З ПАРУСАМІ НЕ ПРАЦУЕ»

## Як сумясціць спорт з кіраўніцтвам федэрацыяй. Таццяна ДРАЗДОЎСКАЯ расказвае пра новую пасаду

**Яна даказала ўсяму свету, што ў парусным спорце могуць перамагаць не толькі марскія дзяржавы. Лепшая яхтсменка Беларусі станавілася чэмпіёнкай свету, Еўропы, пераможцай этапаў Кубка свету і абыходзіла лідараў у гэтым відзе спорту — прадстаўнікоў Галандыі, Даніі, Францыі. За яе плячыма ўдзел у пяці Алімпійскіх гульнях, а ў планах — шостая Алімпіяда. Месяц таму Таццяна ўзначаліла беларускую федэрацыю парусната спорту, але сваю спартыўную кар'еру заканчваць пакуль не збіраецца. Як адчувае сябе яхтсменка на новай пасадзе і якія праблемы бачыць у сваім відзе спорту, яна расказала ў інтэрв'ю «Звяздзе».**



— Наогул, гэта прызначэнне стала для мяне нечаканым, я толькі прыехала з этапа Кубка свету і атрымала вось такую прапанову. Скажу шчыра, пагадзілася не адразу, таму што для мяне гэта вялікая адказнасць — узначальваць федэрацыю віду спорту, да якога я так прыкіпела, аддала палову свайго жыцця. Але каманда (члены федэрацыі, выканкам, намеснікі) мяне падтрымала, я вельмі рада, што працую з прафесіяналамі, на якіх у любы момант можна спадзявацца. Яны далі мне магчымасць і далей рабіць тое, што я ўмею — ганяцца. Сумяшчаць гэта з кіраўніцтвам — мабыць, было маёй адзінай умовай, бо здаецца, я магу быць на высокім міжнародным узроўні. Тым больш, дасягнуты яшчэ не ўсе мэты. Дарэчы, пакуль у свеце парусната спорту ні адзін дзеючы спартсмен не ўзначальваў сваю федэрацыю.

***— Калі прымалі рашэнне, з кімсьці раіліся?***

— Не, бо толькі я буду адказваць за вынік сваёй працы. Можна доўга раіцца, але выбар усё роўна прыйдзецца рабіць самой.

***— Як хутка заступілі на пасаду?***

— На наступны дзень мне трэба было ўжо падпісаць нейкія дакументы. Паўстаў канфуз, калі мне пачалі даваць справаздачу людзі, ставіць у вядомасць нейкіх спраў, планаў. А калі некаторыя пачалі называць мяне імем па бацьку — быў шок! Я хацела б адысці ад гэтых нюансаў.

***— Што захацелася змяніць у айчынным парусным спорце ў першую чаргу?***

— Я ж была спартсменкай, таму не падыходзіла да гэтага пытання з боку кіраўніка федэрацыі. Змяняць усё адразу, у адно імгненне, я не магу і не трэба спрабаваць гэта рабіць. Зараз да ўсяго прыглядаюся. З боку спорту, мне здаецца, я магу даць многае, бо даўно на міжнароднай арэне, ведаю ўсю сутнасць, ды і мяне шмат хто ведае. Змяняць усё не варта — у нас выдатна працуюць трэнеры, у нас ёсць дзеці. Галоўная праблема сёння ва ўсіх відах спорту — гэта пытанне, як спыніць моладзь, якая, дасягаючы 16—17 гадоў, пакідае спорт. Цяпер не так, як у СССР — спорт адкрываў для дзяцей масу магчымасцяў. Сёння яны прыходзяць, ужо многае маючы, іх нічым не здзівіш, складана знайсці для іх матывацыю.

Што датычыцца міжнароднага вопыту, то тут таксама трэба дзейнічаць вельмі асцярожна. Возьмем Германію ці ЗША, гэта ж зусім іншыя краіны — эканоміка, маштаб. Не атрымаецца ўзяць іх мадэль і перакласці на нашы рэаліі, нам неабходна знайсці лепшыя моманты і ўзяць іх для сябе.

***— Фінансавыя праблемы ёсць?***

— Так, на жаль, наш від спорту дастаткова тэхнічны і вынік шмат у чым залежыць не толькі ад спартсмена, але яшчэ і ад матэрыяльнай часткі (так называюць абсталяванне, на якім выступае спартсмен-паруснік). Каб канкураваць на высокім узроўні, трэба адпавядаць. Калі ёсць грошы, спартсмен купляе 10 лодак і адбірае лепшую, а мы купляем адну, і ўзнікае такая сітуацыя — альбо ты ўгадаў з выбарам, альбо не. Калі не, то давядзецца змірыцца з той думкай, што ты не будзеш 3-м або 5-м, а будзеш 10-м.

Федэрацыя сёння вельмі многае робіць для спартсменаў, шукаем спонсарскую дапамогу, але гэта вельмі цяжка. Від спорту не настолькі відовішчны, гледачоў прыцягнуць складана, рамантыка з парусамі тут не працуе.



***— Усё часцей у беларускім спорце кажуць пра праблему трэнерскіх кадраў...***

— Калі маладым трэнерам не будуць плаціць нармальны заробак, яны будуць сыходзіць. Я не за тое, каб нашы трэнеры хадзілі па барах і сілкаваліся выключна ў рэстаранах, але тая зарплата, якая ёсць сёння, таксама не адпавядае іх узроўню і той рабоце, якую яны робяць. Праблема ў гэтым, і, калі б не фінансавы бок, з паруса б не сыходзілі маладыя спецыялісты, якія толькі што скончылі БДУФК. А яны для нас вельмі каштоўныя, бо толькі самі пакінулі спорт, ведаюць новыя тэндэнцыі. Не хочацца іх губляць, але пачакалевы я магу іх зразумець.

***— Вы ўпэўнены, што кіраўніцтва федэрацыяй не паўплывае на вашы спартыўныя вынікі?***

— Так, нягледзячы на тое, што цяпер у мяне, вядома, стала менш часу і больш адказнасці. Напрыклад, калі трэба ўдзяліць час маладым спартсменам, я не магу сказаць «не», у мяне не можа быць прычын на гэта, я проста не знаходжу іх для сябе.

***— Алімпіяда ў Бразіліі стала для вас пятай...***

— Так, а яшчэ вельмі няўдалай. У нашым класе на Гульнях лодкі прадастаўляюць арганізатары, каб усе былі ў аднолькавых умовах, але аднолькавым нічога не бывае. Просты прыклад: у мяне мачта была настолькі жорсткая, што паказаць высокі вынік было проста немагчыма, а датчанка, якая заняла 3-е месца, кожны дзень гнула мачту ў адваротны бок, бо яна была настолькі мяккая, што пасля кожнага дня выгіналася. Такія праблемы меліся ў многіх. Француженка, якая на працягу двух гадоў не выпадала з сусветнай 10-кі, стала 20-й, я — 19-й. Вядома, гэта не той вынік, на які я разлічвала.

***— Думкі скончыць кар'еру пасля гэтага былі?***

— Не, мяне ўсе вельмі моцна падтрымалі, не было ніякага ціску. Мне здаецца, больш за ўсё я сама сябе дакарала і прыгнятала. Таму што па натуры максімаліст і не магу змірыцца з дрэнным вынікам, магчыма, было б нават лягчэй, калі б мяне «затапталі». Трэнер, які падчас гонкі сядзіць у катары і бачыць усё збоку больш аб'ектыўна, чым сам спартсмен, таксама сказаў, што са штаноў выскачыць немагчыма, я зрабіла ўсё, што магла.

***— У самым пачатку нашай размовы вы сказалі, што не ўсе мэты дасягнуты...***

— Усё, акрамя алімпійскага медаля, у мяне ўжо ёсць. Я ўзначальвала сусветны рэйтынг, была чэмпіёнкай свету, Еўропы, двойчы выйгравала Кубак Еўропы, але пакуль усё адно не магу спыніцца. У нас расце моладзь, ёсць перспектыўныя дзяўчаты. Калі яны будуць на маім узроўні, то магчыма, прыйдзецца развітацца з гэтай марай. Пакуль у стане, я буду рабіць усё магчымае для сваёй федэрацыі, краіны і людзей, якія вельмі шмат для мяне зрабілі. Не для таго, каб нешта даказаць, а каб аддзячыць.

***— Але ўсё ж сваёй галоўнай перамогай вы называеце нараджэнне сына.***

— Так, яна і спартыўная, у тым ліку, таму што праз год і тры месяцы пасля гэтага я выйграла чэмпіянат свету. Да 6-га месяца цяжарнасці выходзіла на ваду і паўнавартасна трэніравалася, потым ужо займалася ў басейне. Нараджэнне сына стала магутным штуршком для мяне, аднаўленне павінна было прайсці вельмі хутка, мы з трэнерам разлічвалі на гэта. Аднак, выйшаўшы на звычайную прабежку, я зразумела, што не бягу, а іду гусіным крокам. Пасля такога цяжка пераадолець сябе і сказаць: «Таня, ты можаш!» Толькі дзякуючы трэнеру, які ўвесь час казаў: «Нічога, паступова набяром форму!», я паверыла ў сябе.

**«Пакуль у свеце парусната спорту ні адзін дзеючы спартсмен не ўзначальваў сваю федэрацыю».**

***— Часта вы казалі пра тое, што пра Беларусь у свеце вельмі мала ведаюць, цяпер нешта змянілася?***

— Не, я ў такім шоку заўсёды знаходжуся. У сусветнай эліце парусната спорту я ўжо гадоў 20, а нас усё роўна працягваюць блытаць з Балгарыяй. Літаральна нядаўна, на апошнім этапе Кубка свету ў Францыі, я вельмі добра прайшла медальную гонку, фінішавала другой, а каментатар, каментуючы рэгату на беразе, кажа: «Таццяна Драздоўская з Балгарыі ідзе другой на гэтым адрэзку». Патэлефанавала нашаму прэс-сакратару федэрацыі, сказала, што абавязкова трэба пісаць ліст у Міжнародную федэрацыю, — няхай арганізатары і людзі, якія маюць дачыненне да парусната спорту, вучаць краіны. Яны ж не называюць Аўстралію Аўстрыяй або Германію Алжырам, таму што выдатна ведаюць, якія санкцыі будуць ужыты.

***— У найбліжэйшы час наша краіна прыме шэраг буйных спартыўных турніраў, хтосьці кажа, што гэта лішнія выдаткі, а хтосьці, наадварот, рады гэтым падзеям. Як ставіцеся да пытання вы?***

— Я — як не эканаміст, а вялікі аматар спорту — лічу, што для Беларусі гэта вельмі добра. Папершае, шмат дзяцей можна зацікавіць такімі мерапрыемствамі, прыцягнуць да спорту, па-другое, буйныя спартыўныя спаборніцтвы — гэта заўсёды відовішчнае, цікавае, прыгожае свята, гэта гуртуе людзей і стварае добрую атмасферу ў грамадстве.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

---

■ Будзем знаёмыя

# ВЯНОК ПАШАНЫ — З СЕРБІІ

### Кнігу паэзіі Максіма Багдановіча ў перакладзе на сербскую мову прэзентуюць у Мінску

**На імпрэзе, што пройдзе сёння ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча, сваю работу прадставіць сама перакладчыца, літаратарка Даяна Лазаравіч.**

Упершыню ў Беларусь Даяна Лазаравіч, тады студэнтка філалагічнага факультэта Універсітэта Бялграда, завітала ў 2013 годзе. Неўзабаве на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» выйшла нізка яе вершаў, напісаных пабеларуску. Захапленне нашай краінай і мовай, якую, як прызналася сама Даяна, яна выбрала для вывучэння з-за экзатычнасці, паступова ператварылася ў сапраўдны прафесійны інтарэс. Дзяўчына напісала і абараніла магістарскую дысертацыю па тэорыі перакладу беларускай паэзіі на сербскую мову, а не так даўно ў Бялградзе па-сербску пабачыла свет кніга «Вянок» Максіма Багдановіча. І тут не абышлося без амаль містычнага супадзення: выданне, якое планавалася рэалізаваць яшчэ летась, да 125-годдзя з дня нараджэння паэта, пабачыла свет толькі ў канцы мая, у гадавіну яго смерці.

— Нейк па электроннай пошце я атрымаў ліст ад выпускніцы філалагічнага факультэта Універсітэта Бялграда, — гісторыю з'яўлення «Вянка» пасербску расказвае **прафесар, доктар філалагічных навук Іван ЧАРОТА.** — Яна дасылала свае пераклады беларускіх вершаў. Там былі творы Петруся Броўкі, Алеся Бачылы, Максіма Танка, Уладзіміра Караткевіча. Перакладчыца прасіла паспрыяць іх публікацыі. Я пераканаўся, што работа выканана досыць творча і ўдала, і, безумоўна, рэкамендаваў перастварэнні да друку. Пазней атрымаў яшчэ адзін ліст, дзе Даяна выказвала жаданне і далей працаваць у выбраным кірунку. Я шчыра ўзрадаваўся і прапанаваў папрацаваць над перастварэннем «Вянка» Максіма Багдановіча.

Гэтымі днямі Даяна знаходзіцца ў Мінску. Разам з іншымі студэнтамі Міжнароднай школы беларусістыкі наведала Полацк. Перакладчыца адзначае, што Беларусь вельмі прыгожая краіна.

— Беларускую мову я вывучала на працягу двух гадоў, калі вучылася ва ўніверсітэце, — расказвае Даяна Лазаравіч. — Потым амаль яе забылася, бо не было з кім размаўляць. Цяпер стараюся ўзнавіць веды. Упершыню паспрабавала перакласці паэзію, каб самой сабе растлумачыць значэнне верша, а потым проста палюбіла беларускую літаратуру. Усё пачалося з твораў Уладзіміра Караткевіча, гэта вельмі эмацыянальны паэт. Я таксама эмацыянальная.

Дарэчы, пераклад «Вянка» Багдановіча выклікаў цікавасць у супрацоўнікаў бібліятэк Сербіі. Як падзялілася Даяна, многім чытачам цікава было пазнаёміцца з самімі вершамі, даведацца пра Максіма Багдановіча і гісторыю стварэння перакладаў. Але не толькі Максім сёння яднае Беларусь і Сербію ў літаратурным аспекце. Так, у вераснёўскім нумары часопіса «Полымя» будуць надрукаваныя пераклады вершаў сербскіх паэтаў на беларускую мову, а таксама літаратуразнаўчыя, крытычныя артыкулы пра літаратуру Сербіі. А ў часопісе «Маладосць» ужо ў жніўні выйдуць пераклады верша «О так, я пралетар» Янкі Купалы і «Слова — радасць, слова — чары» Якуба Коласа ў перакладзе Даяны Лазаравіч на сербскую мову. Маркуецца, што налета Сербія стане ганаровым госцем Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, а нашы выдаўцы, літаратары ўжо ўвосень возьмуць удзел у кніжнай выстаўцы ў Бялградзе.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

# УВАГА: ГАВОРЫЦЬ І ПАКАЗВАЕ ВІЦЕБСК!

## «ЗОРКІ» КІДАЮЦЬ ТЭЛЕФОН

Традыцыйныя прэс-канферэнцыі з вядомымі творчымі людзьмі — так званыя «Зорныя гадзіны» — можна глядзець у прамым эфіры тэлевізійнага канала «Віцебск» і, калі не атрымалася, у запісе на інтэрнэт-сайце: **http://vtv.by/**.

Сёлета сярод пяці соцень прадстаўнікоў СМІ, якія асвятляюць падзеі фэсту, ёсць і блогеры. Адзін з іх падчас прэс-канферэнцый з вядомымі артыстамі просіць апошніх дапамагчы зафіксаваць на відэа так званы чэлендж. У перакладзе з англійскай мовы гэта слова адзначае «выклік». Хлопец прапануе кінуць яму ўключаны смартфон, які робіць відэа. У эксперыментах ужо ахвотна ўдзельнічалі Нона Грышаева, заслужаная артыстка Расіі, і папулярная расійская спявачка Зара. Блогер намераны «ўвекавечыць сябе на прасторах інтэрнэту», дзякуючы іншым знакамітасцям. Апошнія задаволены.

## НА ВУЛІЦЫ

Ужо трэці год запар у рамках «базару» праходзіць фэст вулічнага мастацтва «На сямі вятрах». Бясплатна пад адкрытым небам выступаюць тэатры, клоўны, мімы, танцоры, майстры вогненных шоу. Сярод заяўленых удзельнікаў, акрамя беларусаў, прадстаўнікі Украіны, Расіі, Швецыі і нават Афрыкі. Насычаны падзеямі «вулічны марафон» распачынаецца 14 ліпеня.

Вельмі шмат людзей прыходзяць убачыць падзеі Дня моладзі. Як і ў мінулыя гады, плошча Перамогі стане эпі-

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



цэнтрам мноства мерапрыемстваў. Хлопцы і дзяўчаты з розных краін запрашаюць на сваё свята 15 ліпеня.

Па традыцыі каля павільёнаў, у якіх прадстаўлены беларускія рэгіёны, таксама бясплатна выступаюць самадзейныя артысты.

## ВОДАР «БАЗАРУ»

Упершыню на фэсце прадстаўлена і парфумернае мастацтва. На незвычайнай выставе «Пахі жыцця» ў Мастацкім музеі можна панюхаць водары, зробленыя і падорадзены Цімацi, Кіркораву, Меладзэ, «Віягры», Каралёвай і іншым «зоркам» шоу-бізнесу. З інгрэдыентамі, з якіх робіцца парфума, аказваецца, можна тварыць цуды. Калі спецыяльна змяшаць, атрымаюцца нечаканыя пахі: гумы, цыгары, пылу...

Я спытаў куратара выставы Дзмітрыя Папова, якім можна было б зрабіць пах «базару»? Той задумаўся і адказаў, што фэст пахне зусім не шашлыком, які робяць у вулічных кафэ. А... спякотай і дажджом. І, як дадала яшчэ адна куратар выставы Вольга Кліп, — ліпай. Тым часам у майстэрні парфумера Улада Рэкунова (творчасць якога прадстаўлена) зрабілі пах, прысвечаны Беларусі. Ён таксама аўтар ідэі і стваральнік водару для самага вялікага парфумернага флакона ў свеце Rekunov&Zapashniy, што зарэгістравана Кнігай рэкордаў Гінеса.

Парфумер аднавіў пахі духоў, туалетнай вады, якія выпрабляліся для сям'і апошняга расійскага цара. Пасля Віцебска выставу плануюць прэзентаваць у Казані, Екацярынбургу і Уладзівастоку.

## У КНІЗЕ РЭКОРДАЎ

Летась вырашылі ў дырэкцыі, што трэба фіксаваць рэкорды «базару». І ў адпаведнай «кнізе» тады з'явіўся першы рэкорд: марафон па чытанні вершаў. На праекце «1000 вершаў аб Віцебску» 17 ліпеня 2016 года без перапынку агучвалі вершаваныя радкі больш за 14 гадзін. Усе ахвотныя змаглі выступіць. Зачыталі больш за 850 твораў. У акцыі ўдзельнічала і дырэкцыя фестывалю.

Сёлета збіраюцца зафіксаваць новыя рэкорды. У прыватнасці, 10 фатографаў зробяць па 100 здымкаў у дзень афіцыйнага адкрыцця фестывалю. Вынік гэтай напружанай працы будзе прэзентаваны на наступны дзень.

А рэзчыкі па дрэве паабяцалі прадэманстраваць на «базары» самую вялікую драўляную лыжку. Сёння, 13 ліпеня, два майстры з Беларусі і Літвы каля канцэртнай залы «Віцебск» пачнуць працаваць над гігантам. Даўжыня лыжкі з асіны складзе 7 метраў. Зробяць яе за некалькі дзён.

Па вялікім рахунку сам па сабе «базар» — рэкардсмен. На постсавецкай прасторы толькі ў Віцебску столькі гадоў запар праводзіцца фестываль такога ўзроўню.

## ПА ФЕСТЫВАЛЬНЫМ ГАДЗІННІКУ

Віцебск традыцыйна падстройваецца пад «базарны» час. У ДАІ распрацавалі схему парковак, у тым ліку і платных. Каб у цэлым «базар» прайшоў без інцыдэнтаў, на дапамогу мясцовым міліцыянерам прыехалі калегі з іншых рэгіёнаў.

Пазней зачыняюцца крамы, а вулічныя кавярні працуюць і ноччу. Графік руху грамадскага транспарту распрацаваны так, каб гледачы змаглі дабрацца дамоў пасля завяршэння начных шоу.

Падчас «базару» праводзяцца сустрэчы дзелавых людзей, міні-фестывалі, кірмашы-прэзентацыі. Традыцыйна праходзіць і выстава «Малы бізнес у фестывальным Віцебску», у ліку арганізатараў якога выступіў і Віцебскі аблвыканкам.

Наконт надвор'я. Як напісаў класік, яно выступае ва ўсіх ролях. Пазаўчора толькі пад вечар пайшоў дождж. Учора — з раніцы. Але дажджы на «базары» не псуюць сонечны і радасны настрой «зоркам», гараджанам і турыстам. Старажытны горад, як і ў мінулыя гады, літаральна на становіцца Меккай для тых, хто хоча Свята з вялікай літары!

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.54 | 21.36 | 16.42 |
| Віцебск — | 4.36 | 21.33 | 16.57 |
| Магілёў — | 4.44 | 21.26 | 16.42 |
| Гомель — | 4.50 | 21.14 | 16.24 |
| Гродна — | 5.11 | 21.49 | 16.38 |
| Брэст — | 5.21 | 21.41 | 16.20 |

## Месяц

*Апошняя квадра 16 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

## Імяніны

*__Пр.__ Андрэя, Варфаламея, Івана, Мацвея, Піліпа, Пятра, Сафрона, Сімона, Якава.*
*__К.__ Маргарыты, Сары, Андрэя.*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

# ЗАЎТРА




**Даты | Падзеі | Людзі**

## 13 ЛІПЕНЯ

**1797** год — нарадзіўся (г. Мінск) Міхал Глушневіч, беларускі астраном. Магістр філасофіі. Скончыў Віленскі універсітэт. У 1819—1848 гадах працаваў у Віленскай астранамічнай абсерваторыі. Вёў назіранні планет, Месяца, зацьменняў зорак Месяцам. У 1824 годзе праводзіў градусныя вымярэнні на тэрыторыі Беларусі. Вынікі праведзеных ім даследаванняў друкаваліся ў 1838-1846 гадах у выданнях абсерваторыі, у часопісе "Веснік астраноміі". Памёр у 1862 годзе.

**1930** год — ва Уругваі пачаўся першы ў гісторыі чэмпіянат свету па футболе. Выбар Уругвая ў якасці месца правядзення спартыўнага спаборніцтва не быў выпадковым. Зборная гэтай краіны перамагла на VIII Алімпійскіх гульнях 1924 года ў Парыжы і IX Алімпійскіх гульнях 1928 года ў Амстэрдаме, пасля чаго гэтая лацінаамерыканская краіна атрымала права правядзення першага чэмпіянату свету па футболе. Спецыяльна да гэтых спаборніцтваў у Мантэвідэа пабудавалі новы стадыён, які ў гонар юбілею незалежнасці назвалі "Сентэнарыа" — «стагоддзе». Усе выдаткі па размяшчэнні гасцей чэмпіянату ўругвайскі бок узяў на сябе. У турніры прынялі ўдзел 13 каманд: Францыі, Югаславіі, Румыніі, Бельгіі, Перу, ЗША, Аргенціны, Бразіліі, Балівіі, Чылі, Мексікі, Парагвая і Уругвая.

**1942** год — нарадзіўся Харысан Форд, вядомы амерыканскі кінаакцёр. Здымаўся ў фільмах «Амерыканскія графіці», «Размова», «Зорныя войны» і многіх іншых. Акцёр мае мінскія карані. Яго бабуля і дзядуля, яўрэйскія эмігранты, родам з Мінска. Пазнаёміліся яны ў Брукліне. Іх дачка стала маці і нарадзіла будучую зорку Галівуда. Перад тым як стаць славутым акцёрам, Форду прыйшлося папрацаваць нават цесляром. Але... у гэтым свеце нішто не бывае выпадковым. Адным з заказчыкаў убудаванай шафы ад Харысана Форда аказаўся кастынг-дырэктар студыі Universal, які падбіраў акцёраў на карціну «Зорныя войны» тады яшчэ нікому не вядомага рэжысёра Джорджа Лукаса. Згубленыя сляды беларускіх сваякоў цяпер Форду дапамагае шукаць Саюз беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў.



**1952** год — нарадзіўся (г. Мінск) Аляксандр Ціхановіч, беларускі эстрадны спявак, народны артыст Беларусі. З 1971 года ў Беларускай філармоніі, саліст вакальна-інструментальнага ансамбля «Верасы». Выступаў (з Я. Паплаўскай) у складзе эстраднага вакальнага дуэта. Аўтар шмалікіх папулярных эстрадных песень. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. Памёр у 2017 годзе.

**1967** год — нарадзіўся (в. Ухлясць Быхаўскага раёна) Алег Шэпель, беларускі спартсмен (інваспорт, лёгкая атлетыка), заслужаны майстар спорту СССР, 5-разовы чэмпіён Паралімпійскіх гульняў, шматразовы чэмпіён свету і Еўропы па лёгкай атлетыцы (1988—2001). Рэкардсмен свету па лёгкай атлетыцы (1988, 1996). Чэмпіён свету (1998), чэмпіён Еўропы (2001) па міні-футболе.

**Было сказана**

**Кузьма ЧОРНЫ, пісьменнік, публіцыст:**
*«Усё золата, якое толькі ёсць на свеце, — нікчэмная драбяза і непатрэбшчына перад самім жыццём».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Калі ў лесе вы сустрэлі мядзведзя, кляшчоў ужо не варта баяцца.**

— Люся, я ненадоўга адлучуся. Літаральна на пару дзён.
— Куды?
— У запой схаджу...

**Вырашыла пахудзець. Таму не стала заказваць піцу, а сама схадзіла па яе.**

— Муж вывозіў старэйшага на дачу — да працы прывучаць. Даручыў яму прапалку градкі з цыбуляй і даў інструкцыю: «выцягваць усё, акрамя цыбулі!». Ванечка ўспрыняў указанне літаральна і вырваў куст парэчак, які рос у пачатку градкі. «Але гэта ж не цыбуля!» — апраўдваўся Ваня потым.
— Праграміст расце.



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2617.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 12 ліпеня 2017 года.